ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Орган Цэнтральнага і Менскага Комітэтаў Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 50 (432) Чацьвер, 5 мая 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у сераду, пятніцу і нядзелю | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

„ПРАВДЕ“ — старэйшай бальшавіцкай газэце, цэнтральнаму органу ЎсеКП(б) у дзень яе юбілею гарачае прывітаньне ад рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Дзень друку

Гісторыя нашага друку непарыўна зьвязана з ўсёй гісторыяй рабочага руху. Заўсёды зьвязаны і спаяны з шырокімі коламі рабочых, бальшавіцкі друк зьяўляўся ня толькі колектыўным прапагандыстым, колектыўным агітатарам, але і колектыўным організатарам. У гэтым быў, ёсьць і будзе яго нявычарпаемы моц.

Як ні складаны і цяжкія былі часы паліцэйшчыны, як ні душылі і прасьледвалі царскія прахвосты бальшавіцкі друк, ён пры самым гарачым падтрыманьні рабочых мас напаўлегальна і нелегальна прабіваў сабе шлях на фабрыкі і заводы, знаходзіў групу, асяродзьдзе рабочых—распаўсюджвацеляў сяброў—падпішчыкаў. Побач з вялізнай організацыйнай работай наш дарэвалюцыйны бальшавіцкі друк падрыхтаваў і выхаваў не адну сотку і тысячу корэспандэнтаў—бальшавікоў-ленінцаў.

Кастрычнікавая рэволюцыя дала сапраўдную волю друку і шырокі прастор яе разьвіцьцю. На грунце гаспадарчага і культурнага ўздыму нашае краіны вырас і ўзмацніўся савецкі друк. З кожным годам ён становіцца найвялікшай зброяй організацыі і мабілізацыі мас у руках нашай партыі.

Зараз, у двухтыднёўнік друку, комсамольскай організацыі трэба высунуць распаўсюджваньне цэнтральнай комсамольскай газэты „Чырвоная Зьмена“—як баявую задачу.

Нашы акругкомы, райкомы і ячэйкі занадта недастаткова зварочваюць ўвагі на гэтую галіну працы.

„Адзін экзэмпляр „Чырвонай Зьмены“ на трох комсамольцаў“—павінен зьявіцца ня толькі прыгожым лёзунгам, але вынікам конкрэтнай работы організацыі.

У гэтым годзе дзень друку супадае з 15-ці годзьдзем старэйшай бальшавіцкай газэты—цэнтральнага органу нашай партыі „Правды“ і лепшым нашым юбілейным падарункам у дзень друку будзе, калі мы будзем бязупынна вучыцца ў „Правды“, як выхоўваць шырокія масы новых будаўнікоў, як дапамагаць справе будаўніцтва соцыялізму.

Друк Беларусі.

Друк на Беларусі мае свае адметныя рысы, якія акрэсьліваюцца: 1) нацыянальнымі асаблівасьцямі БССР, як рэспублікі з многанацыянальным складам насельніцтва; 2) асаблівасьцямі тэрыторыяльнымі (мяжа з Польшчай).

Гэтыя асаблівасьці ў значнай ступені вызначаюць і характар друку. Калі мы возьмем нашы газэты і журналы, то заўважым у адносінах да мовы тры тыпы газэт і часопісяй: 1) газэты і часопісі, якія выходзяць на нацыянальных мовах (беларускай, яўрэйскай, польскай, літоўскай); 2) газэты і часопісі з мяшанаю моваю з перавагаю расійскай мовы і 3) пэрыодычны друк з мяшанаю моваю з перавагаю беларускай мовы.

На ўсёй Беларусі выдаецца 21 газэта (10 газэт з гэтага ліку ў Менску), 15 часопісяй, два бюлетені і адзін статыстычны лісток.

Прэса Беларусі аддае значную увагу справам замежным—Польшча, Заходняя Беларусь.

Небясьпека таго, што ў прэсу могуць прасочвацца шовіністычныя мотывы, зьяўляецца таксама адной з асаблівасьцяй беларускага друку.

Тыраж усіх газэт на 1 красавіка дасягае 90.000 экз. (без «Полесской Правды»).

Пастул трэба адзначыць, што нашы акруговыя сялянскія газэты перажываюць крызіс—8 акруговых газэт маюць тыраж нязвыш 17-18 тысяч, пры чым у гэты лік уваходзяць і такія газэты, як бабруйскі «Камуніст», тыраж якога дасягае 7000 і «Новая Деревня» з 4.000 тыражу.

Прычыны крызісу ляжаць у цяжкіх матар'яльных умовах—адсутнасьць шрыфту, дрэнная папера—з аднаго боку, а з другога—адсутнасьць кваліфікаваных газэтных працаўнікоў.

На будучыню трэба заставіць толькі тыя газэты, якія давялі сваю жыцьцёвасьць, а рэшту газэт зачыніць.

Што датычыць нашых цэнтральных газэт, дык трэба сказаць, што матар'яльны бок іх таксама ня зусім добры.

Нашым лёзунгам у адносінах да газэт на бліжэйшы пэрыод павінна быць «лепш меней, ды лепей». Замест 10 акруговых газэт трэба заставіць 4-5, але узмацаваць іх як матар'яльна, так і працаўнікамі. Разам з гэтым трэба зьвярнуць большую увагу на падняцьце кваліфікацыі газэтных працаўнікоў, узмацніць нашы рэдакцыі камуністамі, павялічыць склад рабочых і сялян за кошт рабсялькораўскага актыву.

Горш у нас абстаіць справа з часопісямі, асабліва з ведамственнымі?

Літаратурных часопісяй маецца 4 («Полымя», «Маладняк», «Узвышша» на бел. мове і «Штэрн» на яўрэйскай мове).

Тыраж часопісяй гаворыць аб тым, што ня ўсе часопісі маюць права на далейшае існаваньне.

Перад намі стаіць задача пераглядзець сетку часопісяй і заставіць толькі тыя, якія вымагаюцца жыцьцём, апошняе асабліва датычыць ведамственных часопісяй.

Вельмі значна ўзрос непэрыодычны друк на Беларусі. У 1926 г. выдадзена 455 кніг розных назваў з тыражом у 1.759.660 экз.

З боку тэхнічнага мы маем значныя дасягненьні. Не заўсёды вытрыманы, асабліва нашы падручнікі, па сваім зьмесьце. Бракуе ў нас дзіцячай літаратуры; амаль што адсутнічае літаратурная марксыцкая крытыка.

Але наогул мы бачым, што з кожным годам лік кніг на бел. мове, што выдаюцца пазамежамі БССР, зьмяншаецца; у той жа час назіраем рост кніжнай продукцыі ў БССР.

А. Сянкевіч.



15 год бальшавіцкай „Правды“



Дзень друку—5 мая—у гэтым годзе супадае з 15-годзьдзем газэты «Правда». Гэта робіць наша сьвята асабліва важным.

Усё жыцьцё і работа першай адкрытай бальшавіцкай газэты неаддзяліма ад гісторыі бальшавіцкай партыі. **75 год «Правды» гэта 15 самых галоўных год гісторыі камуністычнай партыі.**

«Правда», якая зьявілася ў 1912 годзе, была першай дазволенай бальшавіцкай газэтай. Яна была адзінай газэтай, якая ішла супроць царызму і дзень за днём падрыхтоўвала справу рэвалюцыі. Навакол увесь друк знаходзіўся ў руках буйнай буржуазіі, паноў заводчыкаў. Вёска саўсім ня бачыла і не ведала газэт, ня лічачы розных чорнасоценных, «сельскіх» і «царкоўных весьнікаў», якія выпісваліся той ці іншай воласьцю ці царкоўным прыходам.

З паяўленьнем штодзённай «Правды» пралетарый атрымаў сваю газэту, якая стала для яго кіраўніком, дарадчыкам і сябрам. Па ўсёй Расіі зьявіліся падпішчыкі «Правды». Газэты з неўтрыманасьцю чакалі на кожнай фабрыцы, заводзе, у кожнай шахце, у самых забытых кутках. Яна стала нападаць і на вёску.

Царскі урад бясьпярэстанку прасьледаваў і штрафаў яе то за артыкулы, то за рабочыя лісты. Прасьледавалася ня толькі газэта, але і яе падпішчыкі. За кожным чытачом «Правды» наглядалі. Але газэту гэта не зламала, а яшчэ больш зрабіла яе загартованай. Голас «Правды» гучаў усё мацней.

З першага дня ў газэце прымаў удзел увесь цэнтральны камітэт бальшавікоў на чале з Леніным, які з-замяжы прысылаў артыкулы і лісты. Ленін уважліва сачыў за кожным нумарам газэты. Па ідэі Леніна газэта зьвязалася пры дапамозе рабочых карэспандэнцый і лістоў са ўсімі фабрыкамі, заводамі, шахтамі, рабочымі саюзамі. Так утвараліся многатысячныя кадры рабкораў. Лісты рабочых займалі першае мейсца ў «Правде». Яна складалася рукамі рабочых, якія пісалі штодзённа ад варштату, заводу, фабрыкі і майстэрні. У гэтым была галоўная сіла «Правды». Пралетары былі зьвязаны са сваёй газэтай самай кроўнай сувязьзю. Гэтая сувязь з сотнямі тысяч, мільёнамі расла з месяца ў месяц.

Як у царскія гады, так і ў дні керанщчыны «Правда», была баявым штабам бальшавікоў. Адсюль ішла організацыя рабочых і рэволюцыйных сялян, адсюль насылалася на месцы нелегальная літаратура. З дня ў дзень са старонак «Правды» гучаў заклік да барацьбы з царскім ладам, з панамі, з буржуазіяй.

Пасьля Кастрычнікавай рэволюцыі «Правда» працягвае сваю вялізную організатарскую і выхаваўчую работу. Поруч з ёю вырасьлі і другія мясцовыя «Правды», якім яна расчысьціла шлях сваёй работай у царскі час і пасьля лютаўскай рэволюцыі.

«Правда» справядліва ўзвышаецца як першая газэта Саюза, як нястомны і загартаваны барацьбіт за ленінскую справу. Яна працягвае сваю няўтомную работу па выхаваньню пролетарыяту і сялянства, па кіраўніцтву і організацыі мільённых мас.

Б. І.



Ільліч аб друку

Капіталізм рабіў з газэт капіталістычныя прадпрыемствы, арудзьдзі нажывы для багачоў, інформацыі і забавы для іх, арудзьдзі абману і адурэньня для масы працоўных. Мы зламілі арудзьдзі нажывы і абману. Мы пачалі рабіць з газэты арудзьдзе асьвятленьня і навучаньня іх жыць і будаваць сваю гаспадарку без паноў і без капіталістых.

Гэта непаразуменьне, нібыццам-бы літаратура і літаратары (у профэсыйным сэнсе гэтага слова) здольны з посьпехам удзельнічаць у друкаваным органе. Насупроць, орган будзе жывым і жыцьцёвым толькі тады, калі на пяць кіруючых заўсёды пішучых літаратараў прыдзецца 500 і 5000 работнікаў не літаратараў.


Газэта—ня толькі колектыўны прапагандысты і колектыўны агітатар, але таксама і колектыўны організатар. У апошняй адносіне яе можна параўнаць з лясамі, якія будуюцца вакол вазводзімае будынiны, намячаюць контуры пабудовы, палягчаюць зносіны паміж асобнымі будаўнікамі, дазваляюць ім разьмеркаваць працу і аглядзець агульныя вынікі, якія дасягнуты організаваным трудом.

Пабольш праверкі таго, наколькі комуністычна гэта новае...

Возьмем такі сродак організацыі спаборніцтва, як галоснасьць. Буржуазная рэспубліка забясьпечвае яе толькі формальна, на справе падчыняе прэссу капіталу, забаўляючы „чернь“ пікантнымі палітычнымі глупствамі, хаваючы тое, што адбываецца ў майстэрнях, гандлёвых зьдзелках, у пастаўках і інш. пад пеляной „камэрцыйнай тайны“, якая абараняе „священную собственность“. Савецкая ўлада адмяніла камэрцыйную тайну, вышла на новы шлях, але для скарыстаньня галоснасьці у мэтах экономічнага спаборніцтва мы яшчэ амаль нічога не зрабілі. Трэба сыстэматычна ўзяцца за тое, каб разам з няшчадным даўленьнем наскрозь, абманнай і нагла-клеветніцкай буржуазнай прэсы, вялася праца стварэньня такой прэсы, якая-б не забаўляла і ня дурніла масы палітычнымі пікантнасьцямі і глупствамі, а якраз пытаньнямі штодзённай экономікі несла на суд масы, дапамагала сур'ёзна вывучыць іх.

Друк павінен служыць арудзьдзем соцыялістычнага будаўніцтва, азнаямляючы ва ўсіх падрабязнасьцях з посьпехамі ўзорцовых камун, вывучаны прычыны іх посьпеху, прыёму іх гаспадаркі, ставячы, з другога боку, „на чорную дошку“, тыя камуны, якія ўпарта захоўваюць „традыцыі капіталізму“ г. з. анархіі, лодырнічаньня, беспарадку, спэкуляцыі...

ЛЕНІН.



Як газэта вылячыла ячэйку.

Усе комсамольцы Сарочынскай ячэйкі былі настроены прыкладна так:

— **Ячэйка наша слабая, нікудышная. Працы няма. Моладзь адварачваецца ад яе. Сумна... Ды наогул... у комсамоле няма працы.**

Сакратар ячэйкі Міхась Жукаў добра разумеў настроі комсамольцаў, бачыў сам што працы няма, часта аб гэтым думаў, ламаў мазгі, а знайці канец адкуль пачаць ажыўленьне ячэйковай працы—так і няўдавалася.

У Сарочынскай ячэйцы ёсьць комсамолец Піліп. Надзвычайна ён спакойны і працавіты хлапец. Гаспадаром лічыцца хоць і бацька яшчэ жыве, бо так ужо цікавіцца ўсімі гаспадарчымі драбніцамі што старыя бацькі ім нацешыцца ня могуць.

Глядзеў Піліп на працу ячэйкі і думаў аб комсамольцах:

— **Здольныя хлопцы. Даць добры напрамак, умела пакіраваць справай—горы разьвернуць.**

...Комсамолец Піліп ніколі ў газэты ня пісаў. Толькі аднойчы быў на парадзе юнкораў, што адбывалася ў раёне. Уважліва слухаў даклад прадстаўніка комсамольскай газэты і парашыў трымаць з рэдакцыяй сувязь пішучы допісы ў газэту.

Першым яго допісам быў допіс аб дрэннай працы Сарочынскай ячэйкі.

Піліпава «прапраправадзіцельная» у якой пісалося «Што тут напісана—усё праўда. **Зьмясьціце—пісаць больш буду**», а можа парада ячэйцы—«**У нашай комсамольскай газэце «Чырвоная Зьмена» кожны раз апісваецца шмат практычных мерапрыемств, выконваючы якія можна палепшыць працу. Сарочынскія комсамольцы думаюць, што ўсё што напісана ў газэце—да іх ня мае ніякага дачыненьня, а таму і не працуюць. Трэба поўнасьцю скарыстоўваць практычныя прапановы**» паспрыяла таму, што праз пяць дзён допіс быў зьмешчан у газэце.

Піліп атрымаў нумар «Чырвонай Зьмены» са сваім допісам якраз перад пачаткам сходу ячэйкі.

Ішоў з пошты па вуліцы, пераліставаў газэту, шукаў цікавага. Свой допіс без'адрыўна прачытаў некалькі разоў...

На ячэйку Піліп прышоў з добра абдуманай прапановай. У «бягучых пытаньнях» ён прачытаў сходу допіс і выказаў наступнае:

— Каб з нашай ячэйкі больш не сьмяяліся і ня думалі, што Сарочынскія комсамольцы нічога ня варты, прапаную выбраць камісію, якая-б прагледзіла апошнія нумары «Чырвонай Зьмены», пазнаёмілася-б з усімі яе мерапрыемствамі і **намеціла лепшыя з іх для правядзеньня нашай ячэйкай...**

У камісію ўвайшлі: **Міхась, Піліп** і комсамолка **Алеся**.

Піліп узяўся падрыхтоўваць нараду самастойных гаспадароў з комсамольцаў і моладзі. Напісаў раённаму аграному ліст і абавязкова прасіў прыехаць у Сарочыны у наступную нядзелю. Таксама запрасіў на нараду загадчыка саўхозу, сакратара парт'ячэйкі і інш.

Міхась і Алеся старанна рыхтавалі культдзень сялянскай моладзі.

Нарада самастойных гаспадароў прашла вельмі добра. У шэрагу практычных пунктаў пастановы значылася: «**зьвязацца з дасьледчым інстытутам сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна. Пастарацца атрымаць ад апошняга добрай якасьці насеньне і закласьці паказальныя вучасткі**».

... Культдзень адбываўся у Міхасёвай хаце. Моладзі сабралася паўнютка—хоць сьцены раздавай.

Міхась з нястрымнай усьмешкай на твары зьвярнуўся да прысутных:

— У нашай вёсцы праездам заставіўся вядомы эгіпецкі штукар Гараводзін. Зараз ён вам пакажа нешта.

«Гараводзін» вышаў з сянец у спадніцы, у вялікім саламяным капялюшы і чырвонай жакетцы, твар быў пакрыт чорнай матэрыяй, што рабіла «Гараводзіна» пахожым на негра. У руках яго было некалькі шклянак, бутэляк, палачак. Паклаўшы свае рэчы на стале, «Гараводзін» падміргнуў Міхасю. Міхась пачаў:

— Хлопцы, «Гараводзін» ня ўмее гаварыць па нашаму. Я буду за яго тлумачыць.

А з твару так і ня сыходзіла вясёлая нястрыманая ўхмылка.

«Гараводзін» рабіў з вады—кроў, малако, з крыві—ваду і інш.

Усе з зьдзіўленьнем глядзелі і баяліся парушыць цішыню ў хаце. Было вельмі цікава і радасна. А яшчэ больш стала цікава, калі «Гараводзін» зьняў з твару маску і паўстаў прад моладзьдзю Янкам—гарманістым Сарочынскай ячэйкі...

Цяпер Алеся рыхтуе сход усіх дзяўчат вёскі, а Янка—конкурс плясуноў і заплявал.

Спаткаўшыся аднойчы з Піліпам, Міхась сказаў:

— **А знаеш, братка, газэта вылячыла нашу ячэйку. Толькі цікава, хто гэта напісаў?**

— **Так... нехта напісаў**,—хаваючы ў сябе праўду адказаў Піліп.

Зьм. Паваротны.

„Чырвоная Зьмена“ - жывы організм саюзу

Паласа разгортваньня масавай працы.

— Гэта што, усе супрацоўнікі рэдакцыі?—Спытаў мяне аднойчы хлапец які прыехаў з раёну. І ўхмыльнуўшыся—дадаў: Ну, брат, тут скарачэньне штатаў мабыць яшчэ не кранулася!

Мы ўхмыльнуліся.

— Так, гэта працуючыя ў газэце, але ты не пакойся--няштатныя.. Гэта наш актыў.

Што-ж гэта за актыў?

Паходы ў тэатр.

Вось Арoцкер—хлапец з перавязанай рукой з вясёлымі чорнымі, жвавымі вачыма. Ён парэзаў на заводзе сваю руку машынай і цяпер у часе водпуску прадае білеты на спэктаклі моладзі ў Дзяржтэатр. Масавых паходаў у тэатр «Чырвоная Зьмена« організоўвала нязьлічаную колькасьць. Білеты закупаюцца цэлымі ячэйкамі. Сотні моладзі цяпер, як правіла, пакінулі «Савецкую», «брахалку» і прамянялі іх на спэктаклі, вечары, дыспуты. Ці гэта не дасягненьні! Хіба жаль страціць на гэта некалькі гадзін раніцы і вечару?

Толькі адзін раз Арoцкер быў нездаволены... Організавалі вечар Бэтговэнскай музыкі. Білеты надта туга прадаваліся.

--- Абанкроцімся і якога чорта гэтага Бэтговэна выдумалі? Усё роўна моладзь яго музыкі не разумее лаяўся Арoцкер. Але звыш усіх жаданьняў амаль усе білеты былі прадачы. Яшчэ раз падцьвярдзілася, што нашу моладзь цікавяць ня толькі «кірпічыкі».

Хто лепшы шахматысты?

А вось група шчырых шахматыстых. Яны бегаюць з бліскучымі вачыма з напружанымі тварамі з рэдакцыі ў клюб „КІМ“, з клюбу--у Наркамасьветы, з Наркамасьветы--да камэнданту гораду за оркэстрам.

„Чырвоная Зьмена“ організавала вялікі шахматны турнір моладзі. У гэтым турніру ўдзельнічае 250 чалавек юных шахматыстых. Трэба было здабыць ігры, памяшканьне, оркестр.

Паласа нарад

Група жвавых хлапцоў клапатліва зарнуліся за сталом над доўгімі сьпісамі. Гэта—сьпіс адрасоў бацькоў комсамольцаў, якіх трэба склікаць на нараду па зьніжэньню цэн. Адрасы даставаліся хлапцамі на прадпрыемствах, хрыплымі, нецярплівымі галасамі па тэлефону. Нарада прашла звыш усякіх чаканьняў — вельмі добра. Перад гэтым хлапцы спрачаліся.

— Склікаць у першы дзень вялікадню? Каго, жанчыну? Прагарым! Рэдактар ухмыляўся і «распаляў» іх.

— Стаўка, хлапцы! Пагледзім хто каго возьме!



Комсамольскі друк СССР.

Але царква засталася з боку. На нараду прышло звыш 350 жанчын, многія з дзяцьмі. Дзелавіта і з вялікай цікавасьцю абмеркавалі вялікай важнасьці пытаньне.

Рэдакцыяй скліkаліся і яшчэ шмат іншыя нарады па ўсялякім цікавым пытаньням, з прыцягненьнем спэцаў, профэсароў, агрономаў і г. д. Вось гэтыя нарады: 1) нарада па аздараўленьню рабочай моладзі (пытаньне, высунутае на старонках нашай газэты), 2) нарада па ваенізацыі, 3) нарада турыстых, якая паслужыла пачаткам організацыі турысцкага руху на Беларусі. Нарада па пытаньням аб організацыі досугу піонэраў і набываньня імі тэхнічных навыкаў, нарада кваліфікаваных дзяўчат, замужных комсамолак, нарада па шэфпрацы і інш.

Рэдакцыя праводзіла нарады і на раёнах, прымала ўдзел у зьезьдзе гарманістых Бабруйшчыны, конкурсе Аршаншчыны. Цікава адзначыць нараду комсамольцаў-самастойных гаспадароў, праведзеную ў Горках. Яна прашла надзвычайна ўдала і дала першы штуршок, паслужыла асновай організацыі вясковага нядзельнага ўнівэрсытэту

Пасьля праведзеных нарад іншыя раёны і акруговыя організацыі падхапілі гэты вопыт. Праводзіліся нарады самастойных гаспадароў, гарманістых, нарады замужных комсамолак.

Вялікая экскурсыя ў горад Леніна

А 12 мая—вялікая экскурсыя беларускай працоўнай моладзі ў Ленінград—Кранштат---Волхаўбуд. Сюды цяпер накіраваны усе думкі, сілы, ўся энэргія. І так як чарговыя нумары газэты адымаюць увесь дзень---працаўнікі рэдакцыі, удзельнікі экскурсыі, юнкоры, актыў,---пацеюць над экскурсыйнымі справамі па вечарох і начох.

Складаюцца сьпісы, рассылаюцца па акругох, прымаюцца грошы, пішыцца ліст у Пулкаўскую абсэрваторыю, ці будзе добрае надвор'е 14-га мая, складаюцца праграмы, бюджэты, размеркаваньні часу, кожную дробязь як бы не праваронiць... Праца захоплiваючая, недаючая спакою... Рэдакцыі нельга спазнаць. Гэта ня ціхі, адзінокі пакойчык, дзе нахіліўшыся скрыпяць пярыма, рэгіструюць заметкі—як было хаця-б год таму назад. Цяпер вялікае памяшканьне рэдакцыі перапоўнена моладзьдзю. Тут кіпіць і б'ецца жывая крыніца энэргіі.

Куды накіраваны стрэлы газэты

Ад праслаўтых агульных расьцягнутых, доўгіх аддзелаў «рабочая моладзь», «вясковая моладзь», «пытаньні саюзнай працы»—газэта высоўвае баявыя пытаньні. Яна вышла з вузкай комсамольскай рамкі 3 нумару ў нумар яна вымятае бюрократызм, валакіту, безгаспадарнасьць. Стрэлы нашай газэты паразілі нямала конкрэтных насіцеляў зла, высоўваючы пытаньні барацьбы за рацыяналізацыю, рэжым экономіі, барацьбы за паляпшэньне сельскай гаспадаркі, за асушку балот, за ўзмацненьне і паляпшэньне коопэрацыі.

Пералом у газэце вялікі. Газэта зьяўляецца усе больш сапраўдным аружжам Беларускага Комсамолу ў справе ажыўленьня комсамольскай працы і прыстасаваньня яе да запатрабаваньняў моладзі.

Недахопы?

Іх, вядома, таксама не пералічыш. Як гаворыцца:

„Шмат дасягненьняў, але і шмат недахопаў“.

Слаба кіраўніцтва юнкораўскім рухам. Трэба быць куды больш рухавым і гнуткім, каб пасьпець абхопліваць запатрабаваньні розных пластоў моладзі, асабліва вясковай,—клікаць, вывучаць і выхоўваць моладзь па-ленінску, уцягваць у соцыялістычнае будаўніцтва. Зрабіць гэтыя два друкаваныя словы «соцыялістычнае будаўніцтва» зразумелым кожнаму маладому рабочаму і селяніну, на конкрэтных прыкладах зразумелай, простай мовай—вывучаць, як трэба ўдзельнічаць у гэтым будаўніцтве.

І нарэшце беларуская мова. Гэтая перашкода, як гавораць многія нашы актывістыя для пасьпяховай выпіскі газэты. Трэба нарэшце ўцяміць нашай комсамоліі, асабліва актыву, сутнасьць нацыянальнай політыкі нашай партыі. Прыкладам давесьці неабходнасьць вывучэньня беларускай мовы.

У дзень друку—популярызуйце, абмяркоўвайце, судзіце, крытыкуйце сваю газэту «Чырвоная Зьмена», правярайце, як яна спраўляецца з задачамі, ускладзенымі на яе партыяй і комсамолам.

А. С-ва.



Парад бібліотэк

У дзень друку цікавым будзе пад'агуліць весткі, якія кажуць аб тым, што чытае наша моладзь, як яна чытае кніжк[і] і г. д.

Азнаёміўшыся з некаторымі клюбам[і] бібліотэкамі, можна гэтыя пытаньн[і] ўявіць.

Клюб Саўгандльслужачых

Моладзі саюзу, бяручых кнігі ў бібліотэцы—30 проц.—Пераважна чытаюць бе[л]летрыстыку. Ніякіх бесед на тэму як чытаць і што чытаць бібліотэка са сваім[і] абанэнтамі не праводзіла. Рекомендуючы[х] сьпісаў кніг няма, прыходзіцца шука[ць] па каталёгу. Комсамольскай і юнацк[ай] літаратуры мала. Бібліотэкар тлумачы[ць] гэта тым што комсамольскія кніжкі чытае толькі моладзь і іх ня «выгодна» купляць.

Клюб Ільліча МББ.

Вялікая бібліотэка, большасьць кні[г] якой складаюць «старыя» кніжкі. Т[ут] таксама ніякай працы сярод маладых чытачоў не праведзена, не глядзячы на то[е] што тут моладзі ў бібліотэцы каля 50 про[ц]. Прыходзіць хлапец у бібліятэку, катал[ёгі] вялікі і заняты. Ходзіць каля шафаў тады скажа: «Дайце тую што ў левы[м] кутку». А бібліатэкар і не пагледзіць ш[то] гэта за кніжка, выйме № № і дае яе...

Клюб Прац.-Асьветы.

Адна з лепшых бібліотэк гораду. Т[ут] ужо больш лепшы падбор кніг. Ёсь[ць] шмат кніг і для моладзі і аб модад[зі]. Можа на аснове таго, што пераваж[ная] частка (70) чытачоў студэнты, вучні і г. Моладзь чытае пераважна «Цэмент» «М[...] цы»—«Калинникова». На гэтыя кніж[кі] нават ёсьць чарга прыблізна чалавек 1[5-]20.

Клюб „КІМ“

Таксама вялікая бібліотэка. Чытач[ы] бібліотэкі на усе 100 проц. модад[зь]. Ёсьць шмат кніг пра працу КСМ. Выв[е]шаны рэкамэндуючыя лісткі. Але і т[ут] мала зроблена у справе вывучэньня чытача. Я сам чуў як два комсамольц[ы] падыйшлі да сьпісу, (абложкі ад кні[г] абгледзелі яго, а тады выбраўшы аблож[ку] з лепшым малюнкам—узялі гэтую кні[ж]ку.—Раілі-б мы ўсім бібліотэкам, выве[ш]ваючы рэкамендуючыя сьпісы піса[ць] каротка зьмест кнігі. Гэта многа дась чытачу, у яго выбары кніжкі.

У дзень друку ўсе комсамольск[ія] ячэйкі павінны надумаць над пытан[ь]нем: «што намі зроблена практычна таму каб прыцягнуць да кніжкі ўсю м[о]ладзь і асабліва комсамольцаў.

Блакітны.

МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА САВЕЦКАГА САЮЗУ

З дакладу старшыні Саўнаркому СССР А. І. Рыкава на 4-м Усесаюзным Зьезьдзе Саветаў

Асноўны вузел міжнароднай політыкі—у СССР і Кітаі.—Нас правацыруюць на вайну.—Урад СССР—за мір, за разьвіцьцё нармальных адносін з ангельскім народам.—Нашы адносіны з эўропэйскімі дзяржавамі.

Галоўнейшыя вузлы міжнароднай політыкі

Дзе завязаны асноўны вузел міжнароднай політыкі ў сучасны момант?

Мне здаецца, што іх можна назваць два: першы—Кітай, і другі—наш Саюз Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Чаму іменна гэтыя дзьве дзяржавы аказаліся ў асяродку актыўнейшага ўзьдзейнічаньня імпэрыялістычных сіл? Што датычыць Кітаю, дык прычыны мобілізацыі супроць вызваленчага руху кітайскага народу заключаюцца ў тым, што Кітай зьяўляецца вузлом калёніяльнай політыкі. На тэрыторыі Кітаю, па сутнасьці справы, вырашаецца далейшы лёс разьвіцьця імпэрыялізму, ва ўсякім выпадку ў тых формах, у якіх ён разьвіваўся за апошнія дзесяцігодзьдзі.

Наша дзяржава зьяўляецца аб'ектам нападу капіталізму таму, што на тэрыторыі нашай дзяржавы вырашаюцца пытаньні соцыялістычнага будаўніцтва. Умацаваньне гаспадарчай моцы, узмацненьне політычнага значэньня нашага Саюзу азначае перамогу соцыялістычнага спосабу організацыі грамады.

Падзеі апошняга часу ўжо азначылі спосабы, кірунак і тэмп разьвіцьця дзейнасьцяў імпэрыялістых.

Ангельская нота

Выхадным момантам мобілізацыі грамадзкай думкі і варожых нашаму Саюзу сіл зьяўляецца нота г. Чэмбэрлена.

Сапраўдныя прычыны ноты консэрватыўнага ўраду можна ўстанавіць толькі, калі прасачыць за той анты-савецкай агітацыяй, якая вядзецца значнейшай часткай, калі ня ўсёй партыяй консэрватараў.

Галоўнейшымі складанымі часткамі гэтай прапаганды зьяўляюцца: папершае, пытаньне аб царскіх даўгох; падругое, пытаньне аб салідарнасьці рабочай клясы Саюзу з рабочымі масамі Ангельшчыны і, у прыватнасьці, забастоўкай вуглякопаў і, патрэцяе, нездавальненьне імпэрыялістых сымпатыяй кітайскага народу да нашага Саюзу, якую яны называюць «удзелам» Савецкага Саюзу ў кітайскім вызваленчым руху.

Агітацыя за разрыў.

Нота пагражала разрывам. Наша нота ў дастатковай меры адвергнула афіцыйна высунутыя ангельскім урадам палажэньні і абвінавачваньні і выявіла пункт погляду савецкага ўраду па пытаньню як аб магчымасьці самога разрыву, так і аб адказнасьці за яго. Калі судзіць па заявах некаторых міністраў Ангельшчыны, разрыў не адбыўся таму, што быў прызнаны імі не своечасовым, за тым, што і ў міжнародных абставінах і ў самой Ангельшчыне сустрэўся цэлы шэраг затрудненьняў, якія прымусілі консэрватыўны ўрад у сучасны момант ад разрыву адмовіцца.

Шалёная кампанія правага крыла ангельскіх консэрватараў за разрыў адносін прадаўжаецца. Гэтая частка консэрватыўнай партыі лічыць, што разрыў адносін паміж Ангельшчынай і Савецкім Саюзам зьяўляецца вышэйшым праяўленьнем дзяржаўнай мудрасьці консэрватыўнай партыі. З гэтай прычыны вельмі цяжка азначыць, якую лінію будзе ў пытаньнях далейшых англа-савецкіх адносін праводзіць консэрватыўны ўрад.

Урад Савецкага Саюзу, у ажыцьцяўленьне сваёй агульнай політыкі міру, ніколі не адмаўляўся ад перамаўленьняў і лічыць жаданым і магчымым устраненьне сучасных напружаных адносін.

Урад Саюзу перакананы ў тым, што сяброўскія адносіны паміж народамі СССР і ангельскім народам будуць усё-ж разьвівацца, і спроба ангельскіх консерватараў ухіліцца ад разьвіцьця экономічных і політычных сувязяў з Савецкім Саюзам ня прывядзе да посьпеху.

Аб нацыянальна вызваленчым руху.

Нацыянальна-вызвалечы рух Кітаю зьяўляецца цяпер адной з галоўных, калі не галоўнейшай прычынай нездавальненьня савецкім урадам і прад'яўленьня яму ўсякага роду абвінавачваньняў. У сувязі з разьвіцьцём кітайскага вызваленчага руху, гэтае нездавальненьне цяпер абвастраецца. Яно было і раней і пачалося амаль аднячасова з падпісаньнем дагавору, прызнаючага поўную незалежнасьць Кітаю.

Па сутнасьці, у Кітаі інтэрвэнцыя.

У Кітаі цяпер знаходзіцца ваенна-морскіх адзінак: вялікабрытанскіх—80, амэрыканскіх—55, японскіх—12, францускіх—13, італьянскіх—12 і адно гішпанскае, усяго 173 вайсковых караблі. Гэта агромністая ваенная эскадра. Сухапутных войск там знаходзіцца: 15 батальёнаў, 1 дывізыя і 3 брыгады і, акрамя гэтага, яшчэ 3 атрады артылерыі.

Па сутнасьці на тэрыторыі Кітаю ўжо ідзе вайна. Было-б наіўна спрабаваць даказваць, што налічча падобных сіл неабходна толькі для абароны інтарэсаў чужаземцаў, пражываючых у Кітаі. На зразумелай політычнай мове налічча гэтых узброеных сіл азначае фактычную інтэрвэнцыю.

Другім арудзьдзем барацьбы супроць нацыянальнага вызваленчага руху зьяўляецца стаўка на войскі паўночных мілітарыстых і тактыка раскладаньня самога нацыянальнага руху. Па паведамленьням газэт, апошнія падзеі на поўдні Кітаю—расколы нацыянальнага лягеру, пераварот Чан-Кай-Шы адбываюцца не бяз папярэдняй закулiснай падрыхтоўкі з боку некаторых прадстаўнікоў імпэрыялістычных дзяржаў. Усе тыя арміі і войскі, якія агрупаваны ў Кітаі, самі на сабе зьяўляюцца правакацыяй вайсковых сутычак. Гэта ня толькі наш пункт погляду, але гэта добра разумее і сама буржуазія.

У Лігу Нацый ня пойдзем.

У сучасны момант буржуазія нашы адносіны да Лігі Нацый спрабуе выкарыстаць для кампаніі супроць нас, абвінавачваючы ўрад СССР за неўваход у Лігу Нацый у тым, што ён адмаўляецца працаваць на агульную «справу міру»

Мы падтрымоўвалі і будзем падтрымоўваць са ўсёй рашучасьцю кожны сапраўдны рух у барацьбе за мір і цалком і поўнасьцю згодны падтрымаць кожную організацыю, выступаючы супроць вайны, кожную сапраўдную пацыфісцкую організацыю, але ісьці ў організацыі, падобныя Лізе Нацый, мы ня хочам.

Нашы адносіны да пытаньня аб разбраеньні былі ўжо неаднакраць абвешчаны. Я думаю, што я правільна зраблю, калі зноў падцьвержу гэтыя дэкляряцыі і ў сучасны момант; а іменна: што мы згодны ісьці і заклікаем іншыя дзяржавы пайсьці на самыя рашучыя меры ў справе папярэджваньня войнаў і барацьбы з узбраеньнем. Мы прапануем зьнішчыць поўнасьцю сталыя арміі, зьнішчыць вайсковую прамысловасьць і ўстанавіць сапраўдны кантроль з прадстаўнікоў народу, рабочых профэсыйных організацый і сялян.

Дазвольце ў заключэньне ў некалькіх словах спыніцца на нашых узаемаадносінах з асобнымі краінамі Эўропы і Азіі.

З Нямеччынай адносіны нормальныя

Я павінен сказаць, што за мінулыя пяць год у нас ня было падстаў для скаргаў і для якога небудзь незадаволеньня тымі адносінамі, якія ўстанавіліся паміж СССР і Нямеччынай.

Перагаворы з Францыяй

Пасьля некаторага перарыву зноў ад[на]вілася праца франка-савецкай конфэрэнцыі.

Неабходна выходзіць з таго, што дас[ягнень]ні згоды паміж СССР і Францыяй у [не]абычайна моцнай ступені спрыяла-б ум[ацаваньню міру] тварэньню Эўропы і разьвіцьцю гаспадарч[ых] сувязяй паміж абодвымі гэтымі краінамі. П[а]між Савецкім Саюзам і Францыяй няма не[пера]сэдных супярэчнасьцяй політычных і эко[но]мічных інтарэсаў. Адсутнасьць-жа згоды [па] спрэчным пытаньням перашкажае пашырэньн[ю] комэрцыйных адносін між абодвымі дзяр[жа]вамі і пазбаўляе абедзьве краіны тых выг[од], якія яны маглі-б атрымаць з пашырэньня э[ко]номічных сувязяй, якія, бясспрэчна, адбудуц[ца] ўсьлед за дасягненьнем згоды на ўсіх спр[эч]ных пытаньнях.

Прыбалтыка

Нядаўна мы заключылі дагавор аб не[на]падзе і нэўтралітэце з Літвою. Гэты дага[вор] захоўвае моцу, ня гледзячы на зьмены, я[кія] адбыліся ўнутры гэтай краіны.

З Латвіяй, як вядома, мы парафірав[алі] (папярэдне падпісалі) асноўны дагавор. У [су]часны момант вядуцца перагаворы аб канч[атко]вай рэдакцыі прыкладзеных да асноўн[ага] дагавору дакумантаў.

Трэба спадзявацца, што пасьпешна [ві]дуць нашы перагаворы і з Фінляндыяй [і] Эстоніяй.

Адносіны з Японіяй

Адным з перашкод да сапраўднага р[азь]віцьця гандлёвых адносін з Японіяй зьяві[лася] тое, што экономічныя перагаворы, і, у пр[ы]ватнасьці, перагаворы па рыбалоўнай конц[эсі]цыі, яшчэ не закончаны. Урад СССР імкне[цца] ўскорыць гэтыя перагаворы і перайсьці да [пе]рагавораў аб гандлёвым дагаворы.

Мы вядзем політыку міра

З таго, што я вам сказаў, неабхо[дна] зрабіць вывад, што побач з цэлым ш[э]рагам посьпехаў нашай дыплёматыі, по[бач] з паляпшэньнем і разьвіцьцём адносі[н з] некаторымі краінамі і магчымасьцю дас[ягнення] згоды з іншымі краінамі, [на]прыклад, з Японіяй і Францыяй,—аг[уль]ныя сусьветныя абставіны ў адносінах СССР зьяўляюцца куды больш трывожн[ымі], чым гэта было ў часе папярэдняга зьезду.

Зусім не выпадкова што як раз у [су]часны момант, калі лёс імпэрыялізму [ў] значнай ступені пастаўлены пад пагр[о]зу, ненавіджаньне капіталістых супр[оць] нашага Саюзу ўзрастае дзень ад д[ня]. Ці прывядзе гэтае ненавіджаньне да [вай]скных авантур супроць нас, сказаць раз ніхто ня можа.

Саюзны ўрад будзе прымаць усе [ме]хады, каб ня быць захоплены урасплох. Усякага роду варожым камбінацыям [мы] будзем і надалей праціўпастаўляць нязхільную, цьвёрдую політыку міру.

Газэты заходніх братоў

Юнацкі друк на Захадзе мал ады. Сацыялістычныя саюзы моладзі, існаваўшыя пасьля штутгарскага конгрэсу (1907 году) ня мелі свайго пэрыядычнага друку. Яны выпушчалі лятучкі, адозвы толькі да азначаных урачыстых днёў.

Соцыялістычныя саюзы і зараз ня маюць такіх газэт і часопісяў, якія маюць нашы комуністычныя саюзы моладзі, Лік выпушчаемых газэт значна меншы колькасьці сяброў іх саюзаў.

Напрыклад, у

Чэха-Славакіі

нацыянальна-соцыялістычны саюз моладзі налічвае 12-13.000 сяброў у той час, як іх газэта „Млады Проўды" выходзіць усяго ў 3.000 экзэмплярах.

У Нямеччыне

мы маем комсамольскую газэту «Маладая Гвардыя». Дзьве трэці матар'ялу ў газэце складаюцца з лістоў з фабрык і заводаў.

Чытачы «Маладой Гвардыі» на ўсе 100 процантаў--маладыя рабочыя. Яе тыраж у сучасны момант роўны колькасьці сяброў нямецкага комсамолу — 20.000. Трэба яшчэ дадаць, што ў Нямеччыне маюцца і правінцыяльныя газэты комсамолу і, акрамя таго, цэнтральны орган саюзу чырвоных фронтавікоў -- «Юнгфронт».

Другой краінай, дзе выпушчаюцца комсамольскія газэты, мы па праву павінны лічыць

Чэха-Славакію.

У Чэха-Славакіі комсамольскі друк прарабіў за апошні час вялікую працу. Асабліва гэта відаць на вопыце у Падкарпацкай Русі. Тут нядаўна зьявілася комсамольская газэта на русінскай мове і за гэты кароткі тэрмін комсамол завербаваў больш тысячы маладых сялян і стварыў новыя ячэйкі ў вёсцы.

«Праўда Моладзі» на чэшскай мове выходзіць у 6.000 экзэмплярах, «Ротэ Югэндвалт»—на нямецкай -у 5.000 экз., «Фіоро Даўгоша»--на вянгерскай--у 3000 экз., «Дорозд Худобы»--на славацкай мове--у 3000 экз. і «Падкарпацкая моладзь» на русінскай мове--у 2000 экз.

Ва Францыі

выходзіць штотыднёвая комсамольская газэта «Авангард». За апошні год гэтая газэта змагла значна ажывіць свой матар'ял.

Тыраж «Авангарду» роўны 10.000 экз. Акрамя таго для матросаў і салдатаў выпушчаецца спэцыяльная газэта «Казарма» (штомесячная) з тыражом у 16.000 экз.

У Ангельшчыне

з часу першага мая 1926 году комсамол выдае штотыднёвую газэту «Малады Рабочы». Да таго часу гэтая газэта была двухтыднёвай.

У часе забастоўкі ангельскіх гарнякоў газэта «Малады Рабочы» выпушчала дадатак «Змагайцеся, каб перамагчы», спэцыяльна для маладых вугляконаў.

Тыраж газэты „Малады Рабочы" роўны 6000 экз., гэта значыць у тры разы перавышае лік сяброў саюзу.

За апошні год мы мелі агромністае

павялічэньне тыражу газэт

у Кітаі.

Усяго у Кітаі тры комсамольскія газэты, з якіх дзьве выходзяць штотыднёва. Агульны тыраж газэт—22 тысячы экзэмпляраў.

* * *

Вось якія газэты найбольш буйных організацый на Захадзе і Усходзе. Да гэтага трэба яшчэ дадаць газэту Швэцкага Комсамолу (тыраж 13.000), Нарвэжскага, Дацкага, Канацкага, Паўднёва-Слаўскага (выходзіць на трох мовах) і Амэрыканскага (тыраж 3 тыс. экз.).

Усе гэтыя газэты выходзяць як-бы лягальна, але на самай справе яны часта падлягаюць цэнзуры, якая выкідвае ўсё, што яна лічыць „шкодным". Такая цэнзура існуе ва ўсіх буржуазных краінах без выключэньня

У Польшчы, Літве, Латвіі, Баўгарыі, Фінляндыі газэты выходзяць нелегальна.

Акрамя газэт Заходнія Комсамолы выдаюць часопісі для актыву. **С. Ч.**

Газэта падпольля

«Кітайская Моладзь»—штотыднёвая газэта, выдаецца падпольна. Гэтая газэта—часопісь зьяўляецца цэнтральным органам Кітайскага Комсамолу.

Паліцэйскія ішчэйкі канцэсій зорка сочаць за ўсімі друкарнямі. А між тым „**Кітайская моладзь**" друкуецца ў друкарні..

У 1924 годзе вышаў першы нумар «**Кітайскай моладзі**».

— Цун Го-Чынь-Не! «**Кітайская моладзь**»!—толькі адзін дзень маглі свабодна выкрыкваць комсамольцы ў кітайскай частцы гораду. Гэта было пасьля ўходу войск Чжан-Цзун-Чана.

Але цяпер газэта зноў пашла ў падпольле..

Другая газэта кітайскай моладзі—«**Авангард моладзі**»—орган профсаюзаў знаходзіцца пад уплывам Комсамолу. Гэта газэта-часопісь выдаецца спэцыяльна для рабочай моладзі. Яна высоўвае экономічныя пытаньні і патрабаваньня, за якія павінны змагацца маладыя рабочыя Кітаю.

«**Авангард моладзі**» выходзіць кожныя тры дні. Цяпер гэтая газэта перанесена з Шанхаю ў Ханькоў. Тут яна выходзіць лягальна і кожны малады рабочы можа яе чытаць.

— Адозва ЦК Комсамолу з прычыны заняцьця Шанхаю нацыянальнымі войскамі.

— Артыкул—тав. Ленін і Комуністычны юнацкі рух.

— Аб пісьменнасьці моладзі ў правінцыі Цзянсу (галоўным горадам якога зьяўляецца Шанхай).

— Паведамленьне з месц аб барацьбе моладзі.

— Вершы—«Песьня жанчыны-работніцы».

— «Чырвоны Сьцяг»—нарыс.

Вось які матар'ял звычайнага нумару газэты «**Авангард Моладзі**».

Часта газэты ня могуць выходзіць, таму што не хапае сродкаў. Наш абавязак, дапамагчы кітайскім таварышам, каб яны маглі прадаўжаць асьветную і політычную працу сярод рабочай моладзі шляхам свайго друку.

А. Д.

Бюрократаў на чыстую вадзіцу!

Пры шырокім удзеле рабоча-сялянскіх мас зьнішчым бюрократызм і валакіту.

Ці будуць яны прыняты?

Ёсьць у часопісі „Крокодил" цікавая карыкатура: нейкі тлусты, шырокі дзядзя, відаць адказны працаўнік з партфэлем пад пахай, цягне за косу і паказваючы на калядар прыгаварвае:

— „Сёньня, мілая ўжо ня 8-е сакавіка, а 9-е, пагэтаму выкінь з галавы розныя сходы і аддайся хатнім справам." Ўчора піла ты маю кроў,—сьвяткавала, цяпер досыць, прайшло ваша „времечка".

Гэтая карыкатура ўспомнілася мне пры азнаямленьні з „хождением по мукам" беспрацоўных дзяўчат-падлеткаў, пасланых на працу юнсэкцыяй у дзень 8-га сакавіка.

Дзеля адзнакі гэтага дню Наркампрацы выдаў пастанову аб пасылцы на работу ў Менскія працколектывы 100 беспрацоўных жанчын, прычым у лік апошніх увайшлі 13 дзяўчат з юнсэкцыі Біржы Працы.

Дарослыя жанчыны хутка ўстроіліся, а надлеткі...

— Сёньня мілыя ўжо ня 8-е сакавіка... Так, прыкладна адказалі ім загадчыкі працколектывамі вучотчыкоў, поліграф вытворчасьці і г. д.

Шмат часу прышлося патраціць беспрацоўным дзяўчатам, каб устроіцца на працы, абіваць парогі многіх установаў, каб зламаць упартасьць і бюрократызм загадчыкаў працколектывамі, не жадаючых выканаць загад Наркампрацы. Усю гэтую валакіту было-б вельмі доўга апісваць.

Да гэтага часу прыняты на работу толькі некаторыя з гэтых 13-ці падлеткаў; астатнія, якія былі пасланы ў працколектыў друкароў, у працягу усяго часу ніяк ня могуць устроіцца, дзякуючы ўпартасьці загадчыка працколектывам Каробачкіна.

— Няма месца... Няма машын... Прыходзьце праз тыдзень... І хто вас толькі паслаў сюды...—вось якіх адказаў „удостаиваются" дзяўчаты ад Каробачкіна. Яны ўжо нават згубілі ўпэўненасьць у тым, што калі-небудзь будуць прыняты.

Мы чакаем, што адпаведныя ўстановы зьвярнуць увагу на гэту справу, паставяць на належным месцы зарваўшагася „зава" і палажаць канец паўтарамесячнай валакіце.

Я. З.

А ўсё з-за 5-ці рублёў.

Яшчэ ў сьнежні месяцы мінулага году Суражскае спажывецкае таварыства купіла у Менскага аддзяленьня «Вінторгу» 2 скрынкі віна. Апошнія «благапалучна» даехалі па чыгунцы да Суражу, дзе іх чакала ўрачыстае спатканьне.

Трэба вам сказаць, што Сураж гарадок невялікі і прыбыцьцё такога каштоўнага багажу як віны не магло прайсьці міма ўвагі мясцовых жыхароў.

Жартачкі?! Цэлых дзьве скрынкі!

З прычыны гэтага насустрэч каштоўнага багажу накіравалася спэцыяльная «дэлегацыя» ў складзе члена гарсавету тав. Ільліна, сябра праўленьня спажывецкага таварыства тав. Бедэля і іншых.

Распакаваўшы з вялікімі асьцярожнасьцямі скрынку, сочачы пры гэтым каб не пралілося ні кроплі «драгоценной влаги» наша «дэлегацыя» ледзь устаяла на нагах. У скрынцы не хапіла трох бутэляк «спатыкачу» усяго на суму 5 руб. з капейкамі.

Што застаецца рабіць у гэткім выпадку?—Кожная ня згубіўшая розуму установа не стала-б заводзіць доўгай перапіскі, ведаючы, што апошняя будзе каштаваць больш якіхсьці там 5 рублёў.

І пачало пісаць паперкі спажывецкае таварыства ў Менскі «Вінторг». Апошні, акуратна кожны тыдзень атрымліваў адносіну з напамінаньнем аб лічачыхся за ім 5 рублёў. «Вінторг» адказаў, што недастача атрымалася па віне чыгункі і супакоіўся. Ня гледзячы на гэта новыя адносіны паляцелі адна за другой.

Усяму прыходзіць канец. Прышоў канец і цярпеньню суражскіх праўленцаў. Патраціўшы на перапіску з «Вінторгам» больш пяці рублёў, зьвярнуліся яны са скаргай у РСІ, пераслаўшы туды-ж копіі перапіскі.


Па азнаёмленьні з сутнасьцю скаргі, апошняя даставіла працаўнікам РСІ некалькі вясёлых хвілін. Сапраўды, да чаго даходзіць бюрократызм, калі зьвяртаюцца з такімі «важнымі» справамі ў Народны Камісарыят Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі.

Але гэта ня спыніць суражскіх бюрократаў. І зноў ляцяць паперкі паграджаючага зьместу ў «Вінторг», а скарга, на якую не зьвярнула РСІ «належнай ўвагі», накіроўваецца да прокурора Вярхоўнага Суду БССР.

І ўсё з-за пяці рублёў.

З.

„Правда" пры царскай уладзе.



Роднае...

Бывае, што прыходзіцца па якой небудзь прычыне пералістваць падшыўку «Зьмены». Пачнеш пералістваць — і не адарвешся. Успыхне раптам успамін, лізьне памяць цёплым, блакітным агеньком... Другі, трэці, чацьвёрты... І вось у яркім зараве мар параджаюцца знаёмыя карціны, напалову забытыя твары, гучаць словы і веюць пяшчотнай цяплынёю перажытыя хваляваньні...

Кожны нумар мае сваю гісторыю. Кожная старонка, допіс, загаловак, кліша аб чымсьці апавядаюць. Яны апавядаюць ня толькі аб тым, што дашло да чытача, што ўдахнула ў іх наша гарачая будоўля... Яны яшчэ апавядаюць дзіўныя рэчы аб газэтных буднях,--аб родных, пакутуючых і горкіх і нявыразна мілых днях! Аб трагэдыях і комэдыях, якія разыгрываліся ў пакойчыках рэдакцыі, аб невядомых нікому афэрах, аб маленькіх хітрасьцях і грашках, аб муках творчасьці і радасьцях перамог...

Сёньня хочацца падзяліцца з чытачамі абрыўкамі гэтых апавяданьняў.

* * *

У 1924 годзе ЦК займаў апошні паверх шэпрывестнай каменнай грамадзіны на Савецкай вуліцы. Рэдакцыі «**Красной Смены**» далі там паўзмрочны, падсьлепаваты пакой, вокнамі ў двор--калодзеж. Уласна кажучы, гэта вельмі сьмела сказана--пакой быў прадастаўлен рэдакцыі. На дзьвярох яго вісела шыльдачка «**Отдел печати**» і тут афіцыйна знаходзіліся і аддзел друку і рэдакцыі ўсіх комсамольскіх газэт. Але з тэй прычыны, што аддзел друку ў грозным вобразе **Соні Фрай** (яна-ж рэдактар «Смены») толькі часам зьяўляўся ў пакоі, «изрыгая громы и меча молнии», а рэдактары «**Юнгэр Арбэйтэр**», «**Маладзы Араты**» і «**Гвязда Млодзежы**» прадпачыталі працаваць дома (холадна!),--пакой і быў фактычна толькі рэдакцыяй нашай газэты.

За адным сталом, наджаўшы над сабе ногі і нахіліўшы ў бок каштанавую шапку валос, узьсядала загадчыца рэдакцыі, яна-ж сакратар і загадчыца шматлікімі аддзеламі **Алеся Чэрвеньская (Сучкова)**, за другім--знаходзіўся я. Мы абодва былі тады вельмі зялёныя, толькі-толькі панюхалі газэтнага пораху і з скуры лезьлі вон, каб наставіць газэтку «на яць»...

Працаваць прыходзілася літаральна і ў дні і ночы, і я да гэтай пары не магу зразумець, як гэта мы вытрымалі тады і не звапіліся ад змардаваньня.

Зразумела, работа вялася самым саматужным чынам. Аб машынцы мы і марыць ня сьмелі, а абавязкі бухгальтэрыі і кур'ера ўскладаліся на нас, як «надбаўка» да непасрэднай газэтнай работы.

Бывала з вялікімі мукамі выправіш аграмадны артыкул якога-небудзь працаўніка райкомола, ўздыхнеш, абцярэш пот з ілба, перапішаш артыкул начыста і ідзеш паказаць Алесе. Яна адабрае.

Здаецца, усё добра і магчыма пасылаць артыкул у друкарню. Не, браток, жартуеш—артыкул трэба яшчэ згадніць з аўтарам. Палахліва накіроўваўся да яго ў райком, дзе праз хвілю па ўсяму памяшканьню грахочуць абураныя словы.

— Ды ты што--шалёны?... Ты-ж абсалютна сказіў мой артыкул! Ды я разьнясу рэдакцыю, я пастаўлю пытаньне...

Я, прызнацца, палохаюся і дарэмна стараюся пераканаць аўтара ў тым, што ў артыкуле шмат «вады», лішніх, нічога ня кажучых выразаў. На дапамогу прыбягае Алеся і з ёй разам мы, ўрэшце, перакопваем аўтара ў сваёй праваце. Бура сьціхае, аўтар сарамліва пачухвае патыліцу і раптам весела ўхмыляецца:

— Ах вы дзеткі мае... Як-жа вы працуеце... Мучае вас, пэўна, **Соня Фрай**, а?...

Але не заўжды буры канчаліся так удала. Часта прыходзілася перапісваць адзін артыкул па два, тры і нават чатыры разы...

Вялікае здавальненьне давала нам праўка нататак з жыцьця рабочай моладзі. Прыдумаеш удалы загаловак ці вострадумную канцоўку—і шчасьліў бязьмерна! Але асабліва весела мы складалі вядомую ўсім «**Метелку**». Складалі яе часта колектыўна.

Рабілася гэта так: спачатку прачытвалася нататка, якая апавядала факт аб якімсьці хуліганe ці дрэнным комсамольцы, затым прыдумвалася канва «метелочного удара» і прыступалі да творчасьці... Помню, як я і Алеся напісалі поэму аб адным комсамольцу **Рудкевічу** з Вярхуціна, які зрабіў фальшывыя білеты на клубны вечар і раздаў іх знаёмым барышням.

Начала Алеся:

«Луна с неба—во все лопатки»—
ну, Мішка, крой, далей!...

Я лахмачу валасы і пачынаю шукаць рыфму: «Лопатки... сладкий... тетрадки... гадкий...»... Усё не падыходзіць! Зноў: «лопатки... без оглядки... прятки... пятки»... Апошняе слова ўзбуджае творчую думку і я радасна крычу:

— Ёсьць! Пяткі!

— Што пяткі?—не разумее Алеся—якія пяткі?

— Ды вось:

«А у Рудкевича—сердце в пятки»...

— Надзвычайна!—сьмяецца Алеся—цяпер далей...

Калі рыхтавалі нумар, прысьвечаны 7-й гадавіне Кастрычніка, мы засядзеліся ў рэдакцыі да 4-х гадзін ночы. З тэй прычыны, што на заўтра трэ' было несьці матар'ял на прагляд Соне Фрай а 7-й гадзіне раніцы, мы парашылі пераначаваць у ЦК.

Ачысьцілі сталы ад чарнільніц і папер, здабылі ў суседнім пакою тоўстыя папкі якіхсьці тэзісаў і наладзілі іх замест падушак... Напэўна, дзіўную карціну ўяўляў тады асьвечаны месяцам пакой з некалькімі фігурамі на сталох. Ляжалі як нябошчыкі, а былі поўны кіпучым жыцьцём і ў снах бачылі, як скакалі загалоўкі і ўхмыляліся кліша заўтрашняга нумару...

* * *

1926 год.

...Вялікае ўзбуджэньне панавала ў рэдакцыі, калі сталі прыбываць анкеты чытачоў (да 6-й гадавіны газэты мы разаслалі ўсім падпісчыкам анкеты з шэрагам пытаньняў аб газэце).

Газэта ўжо выходзіла тры разы ў тыдзень, у нас была машынка, кур'ер і наогул парадак, а супрацоўнікі набылі чалавечы выгляд... Пакутуючая рамантыка «сонефрайеўскага пэрыяду» зьмянілася захапляючым рэалізмам «эпохі **Курціка**».

Кур'ера, які прынасіў сьвежую пачку анкет, Курцік прадугледжана спатыкаў на парозе пакою і, заўладаўшы пачкай, прочна ўсаджваўся ў рэдактарскае крэсла. Мы ўсе абкружалі яго, як драпежныя зьверы з палаючымі ад нецярплівасьці вачыма: «— Што прынясьлі анкеты?».

Хутка ўскрываюцца белыя паперкі і **Курцік** сыпле кароткімі заўвагамі:

— Хваляць фэльетоны.. Лаюць хроніку... Міжнародны не спадабаецца, патрэбны сводкі... Добры вясковы аддзел--толькі больш трэба пісаць аб батраках.. Слаба асьвятляецца экономпраца...

Рэдакцыйны колектыў жадна хапае на ляту гэтыя словы, правярае сабе—гэта-ж голас мас, самы строгі і самы верны суд над газэтай!

* * *

Мы так захапіліся разборам анкет, што запамяталі пра неабходнасьць здаваць матар'ял у набор, а ў нас здача ідзе па гадзінах.

У рэдакцыю з шумам убягае худзенькі, у ўсіх нас карыстаючыся вялікім каханьнем, тав. **Фрыдман** (старшы наборнага аддзяленьня друкарні).

— Дзе матар'ял? Давайце матар'ял! Прастой запішу на вас!

Курцік бачыць, што становішча сур'ёзнае—дае нам загад хутка рыхтаваць матар'ял, а сам зварочваецца да **Фрыдмана** прыемным голасам:

— Тав. **Фрыдман**, ці бачылі вы «Кармэн»?... Там ёсьць такая арыя...—і Курцік пачынае нешта мурлыкаць, у той жа час хутка прагледываючы абвесткі для газэты.

Твар **Фрыдмана** праясьняецца, ён адкашліваецца і пачынае падпяваць нявыразным ценарком.

«Торреадор, смялее в бой,
та-ра-рам, та-ра рам»

нясецца па рэдакцыі... Аднак, доўныя сьпевы працягваюцца нядоўга. **Фрыдман** успамінае пашто ён прышоў, абрывае арыю па самай трогацельнай ноце і зноў крычыць:

— Чаго вы мне зубы загаварваеце!... калі зараз-жа не дадзіце матар'ял—я пайду і запішу прастой... Ну?

Тады Курцік ад пяшчотнай «Кармэн» пераходзіць да больш простых і верных рэчаў:

— Зачыніць дзьверы—загадвае ён—вокны таксама.. так... працягвайце працу...

Мы хутка пішам і давімся са сьмеху.. **Фрыдман** нешта крычыць, стучыць кулаком па сталу, ламае дзьверы. Але Курцік невазьмуцімы, і толькі калі ўвесь матар'ял ужо гатоў, ён далікатна адчыняе дзьверы і ў іх бомбай выляцае абураны **Фрыдман**.

Гэта было даўно...

Зараз гэта толькі ўспаміны...

* * *

Цяжкая і адказная праца ў газэце, трэба шмат аддаваць сіл і энэргіі.

Але ці знойдзеце вы на сьвеце іншую больш цікавую і захапляючую працу, чым праца ў газэце і ў асаблівасьці ў комсамольскай газэце!

Міх. Гольдбэрг.

Пчалярства узмацніць гаспадарку беларускага селяніна

„У цёмнай цямнушачцы, сядзяць чарнушачкі і вязуць вязаначкі—ні вузла, ні пяцелячкі“. (Народная загадка).

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА ПЧОЛ.

Значэньне і карысьць пчалярства ў сельскай гаспадарцы.

З кожным годам колькасьць насельніцтва ўсё больш узрастае, а зямлі застаецца ранейшая колькасьць. Амаль усё, што можна было араць—паўзорвалі. Цяпер трэба клапаціцца, каб больш атрымаць прыбытку з плошчы зямлі, якая зараз засяваецца.

Сапраўды, вырабам у самы час палеў, ужыткам розных угнаеньняў пладазьменнай увядзеньнем у выраб зямлі розных прылад, машын і інш. чалавек знайшоў мажлівым павялічыць ураджай збожжа і траў.

Такім чынам, усякі селянін, маючы кавалак зямлі, павінен клапаціцца па меры сваіх сіл і ўменьня скарыстаць гэту зямлю мажліва лепш, каб нічога дарэмна ня згінула, а прынасіла яму карысьць. І вось, калі земляроб зьбярэ ўраджай палёў і лугоў, а ўласьнік саду і гароду—пляды і гародніну, дык нам здаецца на першы погляд, што яны скарысталі зямлю ў гэтым годзе, як належыць, і сабралі ўсе падарункі, якія вытвараны зямлёй. А сапраўды, селянін, які ня мае ў сябе пчальніка, страчвае дужа многа багацьця і пры тым, такога, якое ён сабраў-бы бяз усякай з свайго боку працы.

Гэта багацьце знаходзіцца ў некатары (сок) кветак раскіданых у вялізнай колькасьці па зямлі, а дарэмныя работнікі—пчолы.

Яны зьбяруць нектар, пераробяць яго ў мёд і воск, а гаспадару застанецца толькі скарыстаць прадукт іх працы для свайго спажываньня і прадажы.

Пчалярствам можа займацца ўсякі, хто мае хоць невялікі кавалак зямлі, дзе можна паставіць пчол, каб яны пачалі працаваць, а ніва мёдазбору амаль што заўсёды забясьпечана прыродай. Пчолы межаў ня ведаюць, яны працуюць па ўсёй плошчы зямлі і бяруць узятак з садоў, лугоў і палёў, якія і не належаць да іх гаспадара.

Асабліва важна тое, што пчолы зьбіраюць такую матэрыю (нектар з кветак), якая бяз іх гіне дарэмна.

Апрача мёду і воску пчолы прыносяць вялізарную карысьць у сельскай гаспадарцы яшчэ і тым, што яны поўзаючы па кветках, апыльваюць розныя расьліны, ад чаго бывае значна больш ураджаю з садоў, гародаў, палёў і лугоў.

На колькі пчалярства зьяўляецца важным у эканамічным жыцьці селяніна, відаць з таго факту, што селянін пчаляр бывае заўсёды больш заможным і больш спраўным гаспадаром, чымся яго сусед пры аднолькавых зямельных і інш. умовах.

Мёд, як сродак ежы.

Вопыт і нагляданьні мэдыцыны паказваюць, што мёд значна шпарчэй, чым цукер, асьвяжае і захоўвае мускульную сілу, дапамагаючы ў той-жа час шпаркаму і нармальнаму ўзрастаньню организму дзяцей. У гэтым стасунку мёд асабліва карысны людзям аслабеўшым, а таксама пасьля цяжкіх хвароб. У шэрагу харчавых сродкаў мёд, як вуглявод, павінен быць пастаўлены на адным з першых месц.

Мёд, як лекавы сродак.

Гісторыя народу на прыкладах асобных людзей і цэлых краін, якія ўжывалі мёд, даказвае, што мёд абараняе ад розных хвароб, аздараўляе організм, замацоўвае яго і разьвівае доўгавечнасьць. Мёд, як лекавы сродак, надта карысны пры многіх хваробах, напрыклад: пры катарах страўніка, хваробах печані, малакроўнасьці, тубэркулёзу, нэрвовых хвароб і інш. Загэтым у апошні час многія ўрачы пачалі ўказваць шырокім колам насельніцтва на выдатныя пажыўныя і лекавыя якасьці мёду.

Жыцьцё пчол.

Даўно прайшла тая пара, калі пчолы, як якія-небудзь зьвяры альбо птушкі, ні да каго не належалі і нічога ад чалавека не патрабавалі. Калі яны самі сабе выбіралі адпаведнае памяшканьне-дуплёвае дрэва, зямляную нару і інш. Пабудуюць там сабе гняздо, наносяць запасаў і жывуць, плодзяцца, зьберагаючы сябе ад лютай зімы і ад драпежнага зьвера.

Прышоў канец і пчалінаму паляўнічаму промыслу. Бесгаспадарчых пчол амаль што зусім не засталося і калі-б так справа пашла і на далей, дык усіх бы пчол зьнішчылі. Але чалавек зразумеў і ўбачыў небясьпеку для пчол ад дзікага промыслу.

З тае пары ён пачаў трымаць пчол пры сабе, прысвоіў іх і пачаў клапаціцца аб іх, як і аб інш. сваёй жывёле.


Пчаліны рой.

Пчолы жывуць сем'ямі. Сям'я складаецца з некалькіх тысяч пчол-работніц, з адной-двух тысяч трутняў і адной маткі. Пчаліная сям'я завецца **роем**, а памяшканьне, якое займаюць пчолы-**вульлем**.

Пчала-работніца спаўняе ўсю працу як у нутры вульля, так і на волі. Матка толькі кладзе яйкі і ў гэтым адным усё яе прызначэньне. Трутні-ж толькі запладняюць матак і ніякіх іншых работ не спаўняюць. Пчолы і матка ёсьць **самкі**, а труцень-**самец**.

Матка.

Матка ёсьць разьвітая самка, таму што ў яе жаночыя органы разьвіты ўпаўне, а у пчалы яны як належыць не разьвіты і пагэтаму пчала з трутнем ня можа апладзіцца, а апладняецца адна толькі матка. Запладнёная трутнем матка завецца **плоднай.**



На малюнку: 1—матка, 2—трутні, рэшта пчолы рабочыя, 3—матачнік, 4—запячатаны матачнік, 5—адчынены матачнік, з якога выходзіць матка, 6—разгрызены пчоламі матачнік.

Плодная матка кладзе яйкі двух радоў: запладненыя і незапладненыя; з першых выходзяць самкі, а з другіх-самцы, трутні. І пчолы-работніцы і маткі нараджаюцца з адных і тых жа яек, якія нічым не адрозьніваюцца паміж сабой. Матка буйнейшая ад работніцы, і гэта ад таго, што яна ўзгадоўвалася нежнай ядой і знаходзілася ў буйнай ячэйцы.

Для таго, каб матцы быць плоднай, яна павінна вылятаць з вульля на волю і сустрэцца з самцом (трутнем). Такі вылет завецца **брачнай проігрой.** На проігру маладая матка вылятае першы раз на 6-7 дзень па нараджэньні. Калі ня ўдасца ёй сустрэцца з трутнем, дык яна яшчэ вылятае, пакуль не заплодніцца. Аднак, калі пасьля першага вылету пройдзе 3-4 тыдні і матка па якой-небудзь прычыне не заплодніцца, напрыклад, з-за нянаснага надвор'я, дык яна ўжо спыняе брачныя вылеты і застаецца на ўсё жыцьцё «дзявоцкаю», і хоць яна і кладзе яйкі, але не заплодненыя, з іх выходзяць адны толькі трутні. Такія маткі завуцца **трутнёвымі**. Рой з трутнёвай маткай ня жыхар і не работнік, а гэта ад таго, што нараджаюцца толькі трутні, а ня пчолы-работніцы. Сям'я з трутнёвай маткай не дабрабытна і яна раней ці пазьней зусім зьнішчыцца.

Пчолы-работніцы.

У процілегласьць матцы, пчолы-работніцы нараджаюцца з недаразьвітымі жаночымі органамі, значна адрозьніваюцца ад маткі яшчэ тым, што на ніжэйшым баку брушка маюць асобнага роду органы, завуцца яны **васкаўніцы**, якія выдзяляюць з сябе воск—белую, празрыстую матэрыю, якая выступае ў форме чашуек, чаго ў маткі зусім няма. Апроч таго пчолы-работніцы маюць хабаток даўжэйшы, чымся ў маткі, што неабходна ім, каб высмактваць салодкі сок з падвяночкаў кветак, а на задняй пары ножак маюць асобнага роду ўпадзіны са шчотачкамі для зьмяшчэньня пылку з кветак. Таксама на гэтых ножках у пчол-работніц ёсьць пара шчыпчыкаў, якія неабходны ім, каб вынімаць васковыя пласьцінкі з-за колец брушка. На канцовасьці брушка ў пчалы ёсьць джгала для самаабароны. Пчолы-работніцы маладыя вылятаюць з вульля за здабыткам не раней двух тыдняў пасьля выхаду з ячэйкі, г. зн. па нараджэньні, а ўсяго па зьнясеньні яйка да вылету праходзіць пяць тыдняў. Нарадзіўшыяся пчолы бываюць слабыя і ў працягу ўсяго часу да вылету мацнеюць, набіраюцца сілы, і калі стаіць добрае надвор'е, дык яны, звычайна паміж адзінаццаці і трыма гадзінамі дня, штодзённа выходзяць з вульля і аблётваюцца гурбой перад ім, запамінаюць яго абліччэ і мейсца. Такія вылеты завуцца **проігра маладых пчол.**

Але і да вылету за здабычай маладыя пчолы не застаюцца бяз справы; яны выдзяляюць воск, будуюць соты, узгадоўваюць дзетку, берагуць памяшканьне і г. д. Галоўная-ж праца пчол—зьбіраньне салодкага соку з кветак расьлін. Гэты сок, які завецца нектарам, зьлізваюць сваім язычком і зьмяшчаюць у зобіку, які знаходзіцца ў іх брушку. У гэтым-жа зобіку, калі трэба, пчолы пераносяць яшчэ ваду. З расьлін забіраюць пчолы таксама кветкавы пылок, які скатваюць невялічкімі кулькамі на задніх ножках.

У пчол, калі ў іх памяшканьне заходзяць чужыя пчолы, адбываецца бойка, і калі сям'я дабрабытная, моцная, дык яны заўсёды абароняць свой вулей, і нападчыкі звычайна бываюць перабіты. Паміж пчоламі ня бывае бойкі, калі чужыя пчолы заходзяць са здабыткам: з мёдам, кветкавым пылком ці калі ў гаспадароў слабая сіла ці маткі няма.

Пчолы адлятаюць ад свайго памяшканьня за два-тры і да пяці кілёмэтраў. У часе вылетаў многа пчол траціцца: то ветрам саб'е ў ваду, ці схапіць казюлька альбо птушка.

З гэтай прычыны вясеньняга вывадку пчала рэдка дажыве да восені. Далей жыве толькі тая, якая народзіцца ў канцы лета і пойдзе ў зімоўку. Прапрацаваўшая ўсё лета пчала становіцца драхлай, нядужай і менш здольна вынесьці зімоўку і, наадварот маладыя, якія-нарадзіліся ў канцы лета, дасканала выносяць зімоўку і вясной выходзяць бадзёрымі і моцнымі.

Труцень

Труцень, узгадаваны ў больш памясьцікельнай ячэйцы, чым работніца, значна таўсьцей астатняй. Тэрмін выхаду трутня з ячэйкі яшчэ даўжэйшы чым у самак, якраз дваццаць тры дні з паловай: тры дні ў стане яйка, шэсьць з паловай-чарвячком і чатырвацццаць—у стане кукалкі ў запячатанай ячэйцы.

Труцень таксама, як матка, ні шчыпцоў, ні карзіначак ня мае і, апрача таго, ня мае і самага джгала. Хабаток ён таксама мае карацейшы чым у работніцы, але затое ён мае шпаркі лёт, што яму неабходна для здагону за маткамі ў часе шлюбных вылетаў. Труцень, зараз пасьля заплодненьня маткі, памірае. Трутняў выводзяць пчолы толькі вясной і ўлетку для запладненьня маладых матак; увосень жа пчолы іх выкідаюць з вульля вон на галодную сьмерць і застаюцца яны на зіму толькі ў недабрабытных сем'ях: ці ў бязматачнай, ці з няплоднай маткай. Для запладненьня адной маткі патрэбны ўсяго адзін труцень, бо матка запладняецца толькі адзін раз у сваім жыцьці. Ні мёду; ні пылку труцень ня носіць у гняздо, роўна нічога ня робіць і ўнутры вульля.

Узятак.

Усё, што пчолы прыносяць з волі ў вулей-мёд, пылок, ваду і клей, завецца **ўзяткам**. Воск-жа ня ёсьць узятак. Узятак у красавіку і маі завецца **раньнім**, а ў жніўні—**позьнім**. Раньні і позьні ўзятак складаецца з пылку (інакш хлебіна, перга, абножка), вады, клею і, часткова, з мёду. Галоўны-ж узятак пераважна з мёду. Раньні ўзятак-мёд, пылок і вада ўжываецца пчоламі на ўзгадаваньне чарвы, а клей, для закітаваньня шчэлак у вульлі і інш. Галоўны-ж узятак ідзе ў запас на зімовую пару. Мёд і пылок зьбіраюцца пчоламі з кветак дрэў, хмызьнякоў, траў і гародніны. З дрэў найбольш даведваюцца пчоламі: ліпа, клён, бярозка, дуб; з хмызьнякоў: альха, іва, вярба, акацыя, каліна, рабіна, маліна, крыжоўнік, смародзіна і інш.; з гародніны: гуркі, гарбузы, мак; з траў· Іван-чай, глухая кранія, васілёк, доньнік, рапейнік, фацэлід, сіняк, гурковая трава, і з пасяўных расьлін, больш другіх: грачыха, рапс, эспарцэт, белая і швэдзкая канюшына, гарчыца і інш.

Моцны рой прыносіць у дзень мёду да 5 з пал. кілёгр. і больш., слабы--400-800 грам. Расьліны больш усяго выдзяляюць мёду ў цёплае вільготнае надвор'е а таксама пасьля навальніцы. Улетку, калі надвор'е сухмянае і дажджлівае, узятак бывае кепскі, тады і самая моцная сям'я прынясе за дзень ня больш 400-800 гр. Чым бліжэй к пчальніку ўзятак, тым больш наведваюцца да яго пчолы. Чым мацней сям'я тым больш прынясе мёду. Моцны рой у добрым прасторным вульлі можа даць мёду ў даход гаспадару ў адно лета 32-48 кіл. (2-3 пуды.), ды сабе 16 кіл. (1 пуд.); слабы-ж рой ледзь сябе прахарчуе. Кожная пчала наведваецца ў працягу дня да адной якой-небудзь расьліны, напрыклад: ліпы ці грачыхі. У дзень адна пчала абляціць каля дзевяці мільёнаў кветак. Чым больш мёданосных расьлін блізка пасекі, тым больш пчолы прынясуць мёду. Чым раней адчыняецца ўзятак, тым шпарчэй пчолы прыходзяць у сілу. У часе ўзятку ў вульлі застаецца большай часткай нялётная пчала, а старая лётная—амаль што ўся на волі.

Раеньне.

Калі ў дабрабытны год, звычайна, спачатку лета, моцная сям'я адзяляе ад сябе частку пчол з маткай, якія пасяляюцца ў новым вульлі, дык гэта завецца **раеньнем**, а пчолы, якія аддзяляюцца--**першаком**, а астатнія—**паройкамі**.

З першаком часьцей выходзіць старая матка, а з паройкамі--маладыя, якія толькі выйшлі з ячэек.

Перад тым, як раіцца, тыдні за два, пчолы закладваюць некалькі матачнікаў. Матка кладзе ў іх яйкі, з якіх і выходзяць будучыя маткі. Перад тым, як закладваць матачнікі, пчолы рыхтуюцца да раеньня, будуюць трутнёвыя соты для выхаду трутняў.

За тыдзень да выхаду першака праца ў пчол зьмяншаецца: лёт становіцца слабы, пабудова сотаў спыняецца. У той дзень калі сям'я мяркуе, раіцца, зранку (7-8 гадз.) пачынаюць вылятаць трутні, гэта служыць прыметаю, што ў гэты дзень выйдзе рой.

Пчолы часьцей усяго раяцца ў гадзіны раніцы і пры гэтым у яснае, цеплае надвор'е. Яны імпэтна выходзяць з вульля і гурбой носяцца над пасекай пакуль ня выйдзе матка і не сядзець на якое-небудзь дрэва ці сьцябло травы і інш., тады і пчолы блізка маткі пачнуць прывівацца. Праз чвэрць гадзіны (бывае больш і менш) рой зьлятае з прывою і адпраўляецца да раней пагледжанага пчоламі-шпэйкамі памяшканьня, дзе і прымаюцца за пабудову новага гнязда. Часта рой ляціць за некалькі кілёмэтраў (вёрст). Выпадае, што матка, па якой-небудзь прычыне, ня выйдзе з роем, тады рой палятае троху па пчельлі, і хапіўшыся маткі, зварачваецца на старыка г. зн. дамоў і калі надвор'е не пашкодзіць, то гэты рой выходзіць зноў на другі ці ў адзін з наступных дзён.

Часта трапляецца, што ў той час, як выходзіць рой, устаўляецца на некалькі дзён нянасьце, тады пчолы адкладаюць раіцца, разгрызаюць матачнікі і прымаюцца зьбіраць мёд.

Ф. О. Галькевіч.



Вясновая праца на пасецы

Выстаўка пчол.

Першаю работаю на пасецы ўвёсну будзе выстаўка пчол з зімовага памяшканьня (амшаньніка).

Як толькі растане сьнег, выбіраюць добры, цёплы дзень. Перш, чым выносіць пчол з зімовага памяшканьня, трэба зрабіць належны парадак на пасецы. Тыя месцы, дзе будуць стаяць вульлі, трэба ачысьціць ад усякага сьмецьця, пасыпаць чыстым пясочкам. Разьмяшчэньне вульляў на вялікіх пасеках робіцца вельмі блізка адзін ад другога (1 з пал. мэтры), на маленькіх пасеках лепей расстаўляць вульлі ня бліжэй двох мэтраў адзін ад другога.

На выбраных мясцох робяцца падстаўкі, убітыя ў зямлю. Падстаўкі трэба рабіць так, каб вульлі сталі зусім роўна, бо калі паставіць вульлі нахілена, пчолы будуць няправільна будаваць соты; апошняе можа ўнесьці ненормальнасьць у жыцьцё пчол.

Чарвленьне маткі.

Матка пачынае чарвіць (несьці яечкі) з сакавіка, а іншы раз нават і раней. Для таго, каб са зьнесеных маткаю яечак выведіся лічынкі (чарвячкі) і каб далей разьвіцьцё іх ішло правільна, трэба, каб у вульлі было цёпла, бо пчолы ня змогуць сагрэць лічынку, і яна згіне.

З гэтае прычыны вясной на вульлёх павінны быць падушкі. На вялікіх пасеках вульлі выносяць ня разам, а па вульлёў 5—10, калі адна частка вульлёў аблетніцца—выносяць другую і г. д.

Пасьля таго, як пчолы пойдуць у палёт і калі ўжо стане вельмі цёпла, трэба абчысьціць дны вульлёў. У гэты-ж час трэба ўпэўніцца, ці досыць у пчол мёду. Раньняй вясной пчолам патрэбен мёд для прыгатаваньня яды для дзетак. Калі-ж мёду ў вульлі мала, матка зьмяншае чарвленьне. Калі пчалавод заўважыць нястачу мёду, ён павінен паклапаціцца аб падкормцы пчол цукрам.

Падкормка пчол вясной.

Калі ёсьць запасныя рамкі з мёдам, тады збоку гнязда падстаўляюць такую рамку і падкормка гатова. А калі няма мёду, то прыходзіцца падкармліваць пчол распушчаным цукрам («сахарным сіропам») ці з прымешкай мёду. Для прыгатаваньня расчыну (раствору) бяруць дзьве часткі па вазе мёду ці цукру (пяску) і адну частку вады і кіпяцяць.

Каб мёд ці цукар не прыгарэў, увесь час мяшаюць дзеравянай лыжкай. Пену на паверхні расчыну трэба зьнімаць.

Астыўшы расчын наліваюць у пустыя соты і падстаўляюць пчолам у вулей. Можна наліваць расчын у шклянкі ці спэцыяльныя кармушкі. Кармушкі робяцца розных гатункаў.

Кормяць пчол з шклянак так: шклянку трэба абвязаць чыстым мокрым палатном і ставіць у перавернутым выглядзе ў асобныя гнёзды, зробленыя ў падушцы. У тым месцы, дзе пастаўлена шклянка з падкормкай, палатно ці кляёнку трэба падагнуць. Падкормкі даваць трэба зразу шмат, ня менш 2 кілёграм.

Заміж мёду ці расчыну (сіропу) можна даваць кускавы цукар ці цукровыя пліткі, іх кладуць на рамкі п… палатно.

Падрабязговы агляд гнёздаў

Калі стане зусім цёплая пагода, можна зрабіць падрабязговы агляд гнёздаў.

Пры аглядзе асаблівую ўвагу трэ… зьвярнуць на працу маткі, на тое, я… яна чарвіць. Калі матка нясе яечкі ня… правільна, з пропускамі, ці ў яе яечка… маюцца трутнёвыя лічынкі (чарвячкі… такую матку неабходна зьмяніць. Пры аглядзе гнязда трэба глядзець, каб … вульлі не аставалася шмат трутнёва… вашчыны. Соты, якія заплесьнелі і з… брудзіліся, трэба выняць і абчысьціц… а лепш за ўсё зьмяніць на новыя.

Таксама асаблівую ўвагу пры агл… дзе трэба зьвярнуць і на здароўе вульл… Калі ёсьць упалыя ці праколатыя кр… шачкі ў сотах з чарвой, няжывыя л… чынкі ці такога колеру, што адрозьн… ваюцца ад здаровых лічынак, трэба за т… кім вульлём асабліва прасачыць, а леп… за ўсё запрасіць вопытнага пчаляра пр… глядзець ці няма гнільца або якой інш… хваробы.

У гэты-ж час трэба ацаніць сі… гнязда. Калі пчол мала, трэба зьменшы… гняздо, выняць адну ці некалькі рам… ўставіць устаўныя дошкі. А калі р… аправіцца і матка пачне чарвіць, тр… пашырыць гняздо і паставіць пустыя р… кі з вашчынаю. У выпадку, калі р… застанецца бяз маткі (але рой дав… моцны), трэба памагчы пчолам вывес… новую матку. Калі ў вульлі ня будзе я… чак і маладых лічынак, трэба з друг… вульля пераставіць рамку з яечкамі і м… ладымі лічынкамі.

Пчаляр Бабро́ўскі

Літаратурная старонка

Юрка Лявоны.

Наша вясна.

Добра вёснамі сэрца казычыць
Ды ўпівацца каханкі імем.
Паспрабуйце ў вясновым зыку
Адчуваць рэволюцыі гымны!

Не пра мляўую, кіслую ростань
З нязвычайнай, песьнярскай леньню,
Я сягоньня праслухаў проста
Магутныя сьпевы антэн!

Гаварылі: «паўстаньне дрэмле»...
Мне-ж сягоньня здалося — гарыць!
Бо злучае ў адзінае з Крэмлем
Нанкін, Бэрлін і Мадрыд.

На Усходзе вінтоўкі вынулі
Супроць тых, што вякамі грызьлі.
Нехта кажа: «У жоўтай краіне
Барацьба за шчапотку рысу!»

«Барацьба»,—ды грыміць па сусьвету,
«Барацьба»,—ды гучыць перамога...
Каб вясёлае чулася ў ветры —
Не блудзі, што «нэпач» ля парогу!

Каб фокстроты ня рэзалі вуха
І каб крокі зьвінелі стальлю—
Грамадзяне й таварышы!
Слухай,
Што гаворыць
па радые
Сталін!



Юр. Лявонны.

На прадвесьні

Верш у прозе

Яна йдзе...

Расьхістаная, у валосьсі з пахучых туманоў, многарукаў, прыгожая і хмельная...

Разьвярнулася па абшарах—і залысела ружамі зямля, завіліся, набраклі сьцежкі, заягнала ад мляўсьні раньлё..

Пракацілася па абшарах—і загудзелі лясы сінявым перазвонам, палі ўздыхнулі апошнім снегам, заплакала ад радасьці жыцьцё вадой і ўрчлівайшса стрэх.

Раскудлаціліся почкі клейкія...

Пераліваецца па жылах маладое, бунтоўнае, гарачае...

Сонца—сьціснутае кавадла—чырванее над восеньнім молатам...

І наша, здаецца,—а ня ўхопіш!..

Ашчаціпілась праменьнем—не падыйсьці!..

ТЫ-Ж МЯНЕ ПАДМАНІЛА...

Сказаць, што я, старшыня мясцкому краўцоў, кахаю Верку, тэхнічнага сакратара нашай ячэйкі—нельга, але што зуб на яе маю—бяспрэчны факт!

І нічога тут дзіўнага.

Верка—наш тэхсакратар.

У Веркі—стрыжка кольцамі

Вочкі—ня вочкі, а дыямэнцікі.

У Веркі заўсёды мілая, вясёлая ўхмылка.

Або:

Хто атрымаў прэмію за лепшыя сьпевы ў ячэйцы?—Верка.

На гармоніку грае хто?—Верка.

Найлепш лявоніху скача?—Верка.

А па кім дагарае сэрца райкомаўскага піонэрпрацоўніка Мікалая?—Толькі па Верцы.

Дык чаму, спрашываецца, ня быць і мне ўдзельнікам гэтай романтыкі?

* *

Здарылася летась. Точ-точ у майскія дні... на маёўку ячэйкай выходзілі, і самжа, толькі сам вынес увесь цяжар маёўкі: зьбіраў грошы на калякты̆ўны полудзень, падводу шукаў...

А дзесятай гадзіне прышлі ў прыгожы сасновы лес. Хмарамі лёталі птушкі, мошкі і старанна песьнямі апавяшчалі прыход залатога лета.

У ног лесу срабрылася рэчка, абмывала і казытала карэньчыкі вёрб, званочкамі званіла ля езаў.

Прыселі ў цяньку адпачыць. Дзяўчаты гутараць з хлапцамі. А Верка так і ня ўрымсьціцца—кідала-кідала розныя жарты, белкай на дрэва злазіла, а потым давай сьпяваць рамансы з п'есы «На Купальле».

Да таго ўжо люба сьпявала, што здаецца птушкі прыціхлі і старана перайманюць мотывы.

Асабістага ўражаньня ад Веркіных сьпеваў я ніяк не магу апісаць—так ужо сьціснула яна мае грудзі.

І вось з гэтага часу пачаў я цікаваць за Веркай і думаць аб сваім вылучэнстве прад ёй.

Прызнацца, двума мамэнцікамі мне шчасьце ўхмыльнулася, а разам з гэтым і Верка апякла маё ўзранёнае сэрца сваім прагавітым паглядам.

Нутро задрыгала прыемнымі называмі да шчасьця дарагога, да юнасьці імкненьняў.

І толькі сабраўся пайці я з нашым тэхсакратаром у глыбіну сасновага бору, як Мікалай з-за кусту арахавага:

— Верка! Гу-гу-гу!

— Каб табе, думаю,—загугукала ў жываце...

Прыгнала ліха на маю голаву...

А Верка з Мікалаем пад ручкі і ёмка пабеглі з горкі.

* *

Тым-жа днём я аднагалосна ўхваліў:—Дабіцца ад Веркі ўзаемнасьці, чаго і прытрымліваўся па ўчарашні дзень. А колькі гора перанёс?!

... Сядзіць Верка пасьля працы ў ячэйцы і пратаколы перапісвае. Ня выцярпіш чалавек, каб не заглянуць. А яна, як знарочыста—то гляне на мяне, то вочкамі—дыямэнцікамі ў вакенца заглядзіцца, ды так цяжка ўздыхае.

— Верка дарагая, чаму ты так?—возьмеш і запытаешся.

— Ды як-жа, сяджу тут, а ў палітшколу пайсьці і часу няма.

Змоўкну, а Верка ўхмыльнецца і да мяне:

— Зьмітрок любы, папішы крышку, падбягу я ў палітшколу.... Зрабі ласку!

Больш прасіць мяне нечага, самі-ж знаеце—паліціку праводжу і лінію думаю вытрымаць. Саджуся і пішу.

Перапісаў, а Веркі няма. Дай, думаю, ў кінішна падпайду. Купіў білет, стаў першым каля бархатнай заслоны, каб публіку пабачыць, як рухнецца з сэансу. Музыка сьціхла і паваліў народ. Гляджу і вачам ня веру. Верка, тая самая Верка, што ў школу прасілася—выходзіць з сэансу, а за ёй Мікалай публіку просіць не напіскаць.

Чуць ня крыкнуў:—Пратаколы не перапісаў!—ды пасароміўся суседкі, якая пасьмейвалася з прыгожым хлапцом.

Сеў. Пусьцілі стужку. Музыка закрахтала. Агарнула такая злосьць, што здаецца нічога і ня бачыш. Сакоча стужка, а ў галаве: дык яна мяне, старшыню... абманьваць думае?! На заўтра зноў ня вытрымаў—бо не магу застацца на поўшляху.

У другі раз ужо Верка прасілася ня ў палітшколу, а ў амбуляторыю. Хоць можа і ня праў я, што чалавеку ня веру, але... Сьпісы напісаць згоду даў, а як вышла Верка сьлядком за ёй. Зразу бачу—павярнула ў бок працівалежны амбуляторыі... На вуглу Комсамольскай стаіць Мікалай і афішкі падчытвае. Дагадаўся тут, што на спэктакль для моладзі дагаварыліся.—Што, думаю, за эксплёатацыя ў нашай ячэйцы! Свае працы па горла, піонэрскі атрад развальваецца, а тут жаночыя пытаньні дарэмным дадаткам!..

На заўтра спаткаў Верку і давай ёй расьпісываць проста каханьне сваё. Наскольні вытрымаць ня мог! Успамінаю Загс, а яна і чуць ня хоча, насьміхаецца:

— А што гэта за каханьне і з чым яго ядуць?.. Ці можна каханьнем скварыць капусту?..

... Учора сваімі вачыма бачыў, як запісвалася Верка з Мікалаем у Загсе. А таму перашкаджаць сямейнаму шчасьцю больш ня сьмею.

Расказаў вам таямніцы свае душы таму, што ад болі вытрымаць ня мог. А вось хто пачытае і «посочувствует» мне горамычнаму, уздыхнуўшы, — «шкада хлапца»!

Цяпер я часта сьпяваю:

Ты-ж мяне падманіла,
Ты-ж мяне падвяла...

Зьм. Гарошын.



Пятро Глебка.

Маёвае.

Вясна—гэта радасьць,
вясна—гэта шчасьце:
лугі і палеткі цьвітуць,
і хочацца ніцам да долу упасьці,
каб радасьць і там красавала, як тут.

Паглядзіш наўкола:
прасторы, прасторы,
і сьцягі у ветрах шасьцяць,
і сыплецца сонца мільёнамі зораў,
каб выслаць нам золатам шлях.

Май і Вясна—
гэта радасьць і шчасьце,
ня ведалі людзі таго,
за гэтым і гінулі моўчкі так часта,
пакорна ішлі на агонь.

Цяпер не загінуць
маўкліва пакорна,—
запаляць агнямі зямлю;
і сэрцу ня будзе балюча і чорна,
таму я змаганьне у маі люблю.

Вясна—гэта радасьць,
вясна—гэта шчасьце:
лугі і палеткі цьвітуць,
і хочацца ніцам да долу упасьці,
каб радасьць і там красавала, як тут.

С. Шушкевіч.

У будучыну хто ня верыць?!

(Сонэт)

Навальніца плакала над краем,
Сьлёзы буйныя—людзкую кроў ліла.
Вось затым краіна дарагая
Па дажджы так буйна расьцьвіла.

Усё старое—лодка без вясла
У кіпучым моры патапае...
Паглядзеце радасьць узрасла,
Як рунь ірдзіцца залатая!

Дык скажэце хто схіліўся ніц
Без надзеі ў сьветласьць тых зарніц,
Прамень яснасьці, якіх палае?

Хто не бачыць залатую рань,
Што калосься ночы дажынае,
Хто ўвяз у безнадзейнасьць-твань?!.

„Літаратурны гурток пры „Маладняку“

Нядаўна пад гэткай назвай вышла з друку невялічкая брашура ў дапамогу літгурткам пры „Маладняку„.

Брашура зьмяшчае ў сабе дэклярацыю „Маладняка“—г. зн. плятформу на якой стаіць аб'яднаньне, дадзены цікавы артыкул, у якім ставяцца перад літгуртком яго конкрэтныя задачы, прыведзены статут літгуртку, ну і нарэшце—програма заняткаў па літаратуразнаўству, якую карысна мець кожнаму, які хоча паглыбляць свае веды па тэорыі і гісторыі як беларускай, расійскай, так і заходне-эўропэйскіх літаратур.

Выйсьце ў сьвет гэтае кніжкі пакладзе бязумоўна, аснову для організацыі новых літгурткоў пры „Маладняку“.

Брашура разаслана Ц. Б. „Маладняка“ па Акругкомах ЛКСМБ, а таксама яе можна выпісаць з філій „Маладняка“. Бэта.

С. Ліхадзіеўскі.

Сёньня я вясёлы, згінуў сум, як дым.
Пацяклі равочкі веснавой вады.
Радасьцю спавіта галава мая,
Ды чаго цяпер нам сумаваць?!
Весенка-красуня завітала к нам.
Мкнецца промень яркі ў хату з-за вакна,
Зазьвінелі сьпевы вербаў і ракіт.
Гэй, дзяўчаты, хлопцы ўсе мы юнакі!

Кляшторны

* * *

Навальніцаю дні праскакалі.
Пагуляла халодная сталь...
Балявала у палёх, балявала
Вараньнё непаўторны баль.
А цяпер у вясновыя ночы
Нат' ня шэпча ў рэчцы вада
Вецер косьці на полі ня точыць,
Не галосіць людзкая бяда.
Навакол так павабна і ціха
Хоць душу прыгожасьці аддай.
Толькі-б жыць,—
І надзеямі дыхаць,
Толькі-б віць гэты казачны май.

* * *

— Не!..
Жыцьцё ня ружовыя чары!..
(Нехта ў сэрца кідае агнём).
— Што вы трызьніце марныя мары,
Калі зоры клюе вараньнё.
Зараз там,—
Дзе у дальнім прывольлі
Дагарае вячэрні закат
Цэдзіць сьлёзы народная доля
За кулісы тыняных прысад...
Ня дубы палеглі,—не ліпы,
Не дажджы пазьбівалі траву,
Гэта крыўды душу надламілі
Пахілілі на дол галаву.
Не вада зашумела на скаке,
Не вясну агукаюць грачы,—
Гэта там,
На далёкім закаце
Зноў куюць агнявыя мячы...
Чуе сэрца не п'янае „ціха“,
Вось чаму і пылае агнём...
Я ня хочу прыгожасьцю дыхаць,
Калі зоры клюе вараньнё“...

Песьні і частушкі

Ці ня дудка мая

Ці ня дудка мая,
ўх! я, ух! я.
Весялушка мая,
ух! я, ух! я.
Было у бацькі тры сыны,
да ух—я!
Усе трое Васілі.—
да ух—я!
Адзін коні пасець,
Другі лапці пляцець,
Трэці сядзіць на каменьні,
Дзяржыць дуду на раменьні.
«Ах ты дудка мая!
Весялуха мая!
Весяліла ты мяне
На чужой старане.
Як павесіў я дуду
На зялёным на дубу,—
Дуда з дубу звалілася,
На трэсачкі разьбілася.
Ці ня дудка-ж была,
Весялушка-ж мая,
Весяліла-ж мяне
На чужой старане.

А чаму-ж і Халімону так ня жыць?

Ой, і што за гаспадар Халімон,
Бы заможнік сем кароў ма ён.
А паверце людзі добрыя,
Усе каровы яго дробныя
Ледзь цягаюць тыя ножанькі
Тарчаць косточкі ды рожанькі.
А прышла вясна—ня плодзяцца,
Як, быкі тыя, нядояцца,
Бо харчуюцца саломаю,
П'юць ваду, як лёд халодную.
У хляве дзіркі і ў сьценах і ў страсе,
Узімку трасцаю жывёліну трасе.
Паглядзеце на Лявона вы,
На яго парадкі новыя.
У яго каровы бы мядзьведзіцы,
Глядзяць людзі не нагледзяцца.
Карняплоды ды макуху ядуць
І вадзіцу толькі цёплую п'юць.

* * *

Будзь-жа добры гаспадар Халімон,
Даглядай карову, як гэты Лявон.
Даглядай-жа не па свойму,
А пара, браток, па новаму.

З. Бульбянік.



Пра іх,—упяршыню

Яны прыходзяць у рэдакцыю з сшыткамі сваіх вершаў, апавяданьняў, абразкоў.

Яны дасылаюць пачкамі свае творы шчырыя, прыгожыя, ад душы...

Чытаеш, лубуешся, раўнаеш з іншымі і дзіву даешся. Здаецца такія самыя хлопцы як і ўсе іншыя, гэткія-ж сьвіткі, боты, толькі ў некаторых мільгане гальстук на шыі...

Прыходзяць у рэдакцыю з боязьню, з сарамлівасьцю, просяць чытаць іхнія творы пра сябе, каб прысутныя не пачулі іх,—не раскрытыкавалі.

І вялікае задаваленьне, калі яны ўгледзяць свой першы твор—надрукаваным..

Друкаванае слова! Тысячы вачэй чытае цябе—разумее. Ты з няграматнага—робіш пісьменнага, ты—рассаднік культуры ў самых цёмных кутках краіны, да цябе прыслухоўваюцца, на табе вучацца завладаць культурай, быць культурнымі людзьмі...

Таму так дарага ты для тых, хто прыходзіць—у кузьню друкаванага слова, упяршыню, акунаецца ў гэта жыцьцё і першы раз у сваім жыцьці ўглядае свой твор надрукаваным...

Дзень Друку. Сьвята ўсіх працоўных. Але яно ў першую чаргу сьвята тых, хто творыць радкі друкаваных літар...

* * *

Прышоў у рэдакцыю дванаццацігадовы хлопчык.

— Цябе як зваць?

— Алесь Розна... казалі перапалоханыя вочкі піонэра.

— Што скажаш?

— Вось верш... І піонэрчык пакінуўшы на рэдакцыйным стале свой першы вершык, ад сарамлівасьці, ад боязьні проста ўцёк.

Верш яго надрукавалі. Неўспадзеўкі ён чытаў яго. Вочы яго разьбягаліся. Яму хацелася прачытаць і кожную друкаваную літару паасобку, і цэлы верш праглынуць адразу. Таму і разьбягаліся вочы...

Вучылі яго на яго-ж творах, якія ён прыносіў у рэдакцыю. Паказвалі на недахопы, адзначалі добрыя мясьціны, раілі... не пісаць шмат вершаў, а казалі—лепш менш, ды лепш. Казалі:—аўладай сваёй думкай, здолей укласьці яе ў рытмічныя радкі, і лірыка павінна мець зьмест.

А цяпер ён ужо ў ліку выяўленых, цяпер вершы яго друкуюцца, ён ступіў на сьцежку мастацтва. І ад яго патрабуецца ўжо больш чым ад другіх, ня гледзячы на тое, што яму толькі дванаццаць год, ня гледзячы на тое, што ён маленькі піонэрчык.

* * *

Мікола Хведаровіч. Рабфаковец. Прышоў з Капыля вучыцца, і прынёс з сабою... вершы. Гэта было ў 1925 годзе. Надрукавалі.

Цяпер ужо ён маладняковец. Мае бязумоўна віды на выдатнага лірыка-поэту. Цяпер ён ужо кіраўнік літгуртка пры „Маладняку“ на Рабфаку, а прышоў з торбачкай за плячмі, каб вучыцца, каб надрукаваць свае першыя спробы пяра. Кахае друкаванае слова, асабліва любіць чытаць вершы. Ён іх па праўдзе кажучы не чытае, а глытае...

* * *

Яго выгляд зусім не адпавядаў пачынаючаму поэту. Я прызнаюся, што калі я ягона застаў у рэдакцыі, у мяне склалася ўражаньне, як ад звычайнага хлапца—„падшывальца“, якому толькі галубей ганяць...

Пачаў чытаць вершы. Адразу пачуўся размер, музычнасьць, прастата мовы, і самае галоўнае—шчырасьць, вобразы не надуманыя, а ад душы.

Якраз так выпадала, што адразу яго вершаў у чарговых літстаронках выдрукаваць ня мелася магчымасьці. І ён, кахаючы друкаванае слова, у вольную ад працы хвілінку, наведваў рэдакцыю. Пытацца сароміўся. Прыдзе, і стаіць. Спытаешся ў яго:

— Ну як Багунец, вершы мо новыя прынёс?

— Не... адкажа і стаіць, а вочы так і прагнуць прагледзіць новы нумар газэты, які прыносіш з сабою з друкарні..

Цяпер ён выявіўся. Друкуецца амаль што ў кожнай літстаронцы. Піша добра:

„Хутка надыдуць сінія ночы,
„Стануць зьмяіцца зоры—агні,
„Парасьцьвітаюць пралесак вочы.
„Бор цёмны песьняй зазьвініць!

Тут таксама трэба адзначыць яго здольнасьць у выбары сюжэтаў для сваіх твораў, і разнастайнасьць у строфіцы вершаў.

* * *

Просты, сялянскі хлапчына. Да гэтага часу—ня гледзячы на тое, што вучыцца ў горадзе не расквітаўся са сьвіткай. Бацькі—бядняхі. Жыве на белпэдтэхнікумаўскай стыпэндыі. Гаворыць,—здаецца з грудзей вырываюцца гукі вершаваных слоў. Выявіўся на часопісі „Маладыя Араты“, а цяпер шліфуе сябе навукай. Лірык. Поўны радасьці, жыцьця.—Вершы мілагучныя, глыбака ўрэзваюцца ў памяць:

„Скамячу як сьвежку
„Радасьць я сваю,
„І закіну ў плечы
„Сёньняшняму дню.
„Радасьць мая звоніць
„Словам маладым,
„Ад сялянскіх гоняў
„Ад зялёных ніў.
„Ад дуброў шумлівых
„Ад вясковых хат,
„Дзе ўжо ўсход іскрыцца
„Новага жыцьця!..

І ў сваёй творчасьці, такі і сёньня наш малады поэта Шушкевіч. Ён—маладняковец Яго ўзгадаваў комсамольскі друк.

* * *

Рыгор Камлыга—здольны малады бытавік. Піша і прозай і вершамі. Прозай лепш. Сялянскі хлапец. Пяро яго надзвычайна гострае, колкае. Толькі трэба пажадаць яму—апрацоўваць свае творы.

Скардзіцца:

— Часу няма...

А з якой любасьцю чытае толькі што выплыўшы з пад валікаў машыны сьвежы нумар нашай „Зьмены“.

* * *

З далёкага Магілеву пачкамі шле свае творы комсамольскі поэта-маладняковец **Юрка Лявонны**. Адзін з ураджайных. Прышле пачку, друкуем мала па малу, і ня ведаем ні скардзіцца ён на нашу рэдакцыю, ні не... Калі скардзіцца—выбачай. А здольнасьць бязумоўная. Друкуецца і ў іншых беларускіх часопісах і газэтах. Лявонны выявіўся у нас, у комсамольскім друку.

* * *

Астапенку, Панамарова, Ю. Таўбіна ў рэдакцыі мы так і завем „амсьціслаўскія песьняры“. У вершах лірыка, прыродаапісаньне. Тэхнікай вершу аўладалі ўжо.

* * *

Бязумоўна, тут ня прыходзіцца гаварыць пра П. Труса, Пятро Глебку, Кляшторнага, Лужаніна, Васіля Каваля, Сяргея Дарожнага, Маракова, Бобрыка, Звонака і інш. якія таксама ўзгадаваліся за апошнія гады на шпальтах нашага комсамольскага друку і ўжо лічуцца „зусім прызнанымі“.

* * *

З якім замілаваньнем усе яны глытаюць свой першы твор з газэтных шпальтаў! Радасьць вялікая радасьць у вачох... Яны кахаюць друкаванае слова, бо яно крышталізуе, выгартоўвае іхнюю творчасьць, шчырую як каханьне маленьства, маладую як вясна...

Іл. Барашка.

Бойка 250 думак

Першы масавы шахматны турнір працоўнай моладзі

На турніры

Раніца... 10 гадзін...

У залі, дзе адбываецца гульня—ціха. Гуляючыя напруджаным поглядам ашчупваюць дошкі... кожнае праігранае вочко—вяшчун выхаду з турніру!

Ідзе другі тур.

Іграюць шахматыстыя 6-ці груп,

* * *

7 гадзін вечару...

Хутка запаўняецца вялікі ліст паперы прозьвішчамі ўдзельнікаў.

Зараз іграюць шахматыстыя 20-ці груп, **пераважна рабочая моладзь**. Дзяжурны ледзь пасьпявае запісваць прышоўшых, якія пужаюцца перайсьці межы кантрольнага часу...

7 гадзін 15 хвілін, 7—20, 7—30—толькі чуецца навакол...

У пакоі, дзе выдаюцца ігры, шумна:

Дай добрыя шахматы, каб конь быў сапраўдным, а не на вярблюда падобным...

— Хутчэй давай!..

Гульня ў распале. Сотні шахматыстых пацеюць над дошкамі, стараючыся перамагчы адзін другога.

— Выіграў!

— Праіграў!

— Нічыя!

Часам чутны лікуючыся гукі: „шах“ і „мат“...

Адзінокія, прачакаўшыя 40 хвілін шахматыстыя, падыходзяць да рэгістрацыйнага стала, патрабуючы сабе выігрышу з прычыны няяўкі праціўніка.

Праз некалькі гадзін гульні, заля прыкметна пачынае пусьцець.

Шахматыстыя, атрымаўшыя два паражэньні, з зайздросьцю глядзяць на гуляючых. Яны хацелі-б сыграць яшчэ, але сыстэма турніру не дазваляе ім гэтага!

— Што, Колька, праіграў?

— Так, праіграў, але выпадкова. Было добрае становішча, але ўзлаваўся за тое, што праціўнік многа думае, паставіў каня і праіграў...

— Ну, брат, выпадковасьцяй быць ни можа. Няўжо-ж ты ня чуў дакладу профэсара **Васілейскага?..**

Наогул турнір праходзіць вельмі жвава.

Л.



Хто наперадзе?

Пакуль што наперадзі груп ідуць наступныя таварышы: 1 група—**Дакшыцкі С. і Эйдэльман.** 2 група—**Шусар, Вальфсон, Шапіра і Капэц.** 3 група—**Файн і Прэсман.** 4 група—**Мазэль, Камінскі і Трэсман.** 5 група—**Будоль і Хайчын.** 6 група—**С. Левін і Эпштэйн.** 7 група—**Дакшыцкі А. і Лісоўскі.** 8 група—**Іваноў, Лапідус і Розэнблюм І.** 9 група—**Хігэровіч і Розэнблюм С.** 10 група—**Слоўшчэр Л., Цагаловіч і Кобац.** 11 група—**Галко, Ліўшыц А. і Скрыпко.** 12 група—**Баранцэвіч і Папраўкэ.** 13 група—**Кірыленка і Перапечын.** 14 група—**Мазэлеў і Муськін.** 15 група—**Скакоўскі і Хацкевіч.** 16 група—**Сагаловіч і Патрапаўлаўскі.** 17 група—**Гарахоўскі і Адамчык.** 18 група—**Ліўшыц Г. і Хвасьцюк.** 19 група—**Татур і Эльпер.** 20 група—**Герасімовіч С., Вігдорчык і Гардон.** 21 група—**Аўраменка і Манкез.** 22 група—**Гаруйко, Былін і Сліозьберг.** 23 група—**Кантаровіч і Цярэнцьеў.** 24 група—**Пішчака і Фрыдман.** 25 група—**Эцін і Генькін.** 26 група—**Драпкін, Гаркаві і Стральчук.**

Партыя Дакшыцкі—Клімбоцкі

1.e2—e4, e7—e5; 2. кf3, кc6; 3. cc4, кf6; 4. d3, cc5; 5. кc3, h6; 6. ce3, ce7; 7. 0—0, d6; 8. d4, ed; 9. кf3 : d4, кb5(!); 10. cb3, c5; 11. ca4+, cd7; 12. c : d7+, ф : d7; 13. кf5, лd8; 14. к: e7, ф : e7; 15. кd5, к : d5; 16. e : d, 0—0—0; 17. b4(!), крb8; 18. лe1, фe7; 19. b : c, l : c; 20. c : c5, ф : c5; 21. л : e5, лd6; 22. фd3, d6; 23. лb1, крa8; 24. c4, лe8; 25. фb3, лe7; 26. лe8+, крa7; 27. лe8 :, g5; 28. ф : b7+, л : b7; 29. л : b7+, кр:b7; 30. л : e5, здаўся.



ПСЫХАТЭХНІКА ШАХМАТНАЙ ГУЛЬНІ

(З дакладу проф. Васілейскага на ўрачыстым адчыненьні першага шахматнага турніру моладзі)

Псыхатэхніка — гэта навука, якая ставіць сваёй мэтай вызначыць да якой галіны працы больш за усё падыходзіць гэй ці іншы чалавек. Яна навучае нас правілам, дзякуючы якім, можна на даўжэйшы тэрмін захаваць свае сілы і здольнасьці.

Псыхатэхніка шахматнай гульні ставіць прад сабой **дзьве мэты:** а) загадзя даведацца—ці зможа тэй ці іншы чалавек зрабіцца добрым шахматыстым і б) даведацца як захаваць свае шахматныя сілы і здольнасьці.

Развязваючы гэтае пытаньне трэба раней выявіць: **у чым псыхалёгічная сутнасьць гульні наогул?**

Адносна гэтага існуюць некалькі тэорый. З іх дзьве найбольш цікавыя. Першая тэорыя, распрацаваная нямецкім поэтам **Шылерам** і паглыбленая ангельскім філёзофам **Спэнсэрам**, кажа, што людзі, а таксама жывёлы іграюць таму, **што яны павінны разрадзіць збытак здабытай энэргіі.** Але гэтую тэорыю мы цяпер павінны прызнаць ня зусім правільнай, бо людзі са здавальненьнем іграюць у шахматы і інш. гульні часта пасьля цяжкага працоўнага дню. Або дзеці, якія цэлы дзень бегаюць, у любы час зноў прымаюцца за гульню, часта забываючы пра абед і сон...

Сутнасьць другой тэорыі нямецкага вучонага **Грооза** заключаецца ў тым, што жывёлы, а таксама і людзі ў гульні знаходзяць параўнача легкі спосаб трэніроўкі сваіх сіл і здольнасьцяў, якія ім могуць прыгадзіцца ў далейшай жыцьцёвай барацьбе. Гэтую сваю тэорыю **Грооз** пацьвярджае шматлікавымі прыкладамі (вось кацяты: яшчэ маленькія, яны заўсёды бегаюць за камком паперы, падскакваюць, лазяць на дрэвы, дамы. Такіх прыкладаў шмат).

Але гэтая тэорыя, бязумоўна, ня выключае поўнасьцю ўсіх элемэнтаў першай тэорыі.

Затым **проф. Васілейскі** перашоў да разгляду другога пытаньня: чаму іменна шахматная гульня, а не другая, неяк асабліва прыцягвае і захапляе чалавека?



Проф. Васілейскі.

Гэта тлумачыцца многімі прычынамі. Шахматная гульня насычана дынамізмам і напруджанасьцю. У часе гульні шахматысты забывае пра ўсё. Ён у шахматнай дошцы бачыць свой асобны мір, сам зьяўляючыся яго тварцом і кіраўніком...

Шахматы—ёсьць барацьба і да таго-ж гэтая барацьба носіць утанчоны характар бяз элемэнтаў фізічнай сілы (бойка) і элемэнтаў выпадку (азартныя ігры).

У шахматах вялікую ролю грае знаходжаньне, дагадка, строгая лёгіка і разумовы разьлік.

Шахматы прымушаюць чалавека спытваць цэлую гаму самых рознастайных адчуваньняў.

Шахматы—гульня соцыяльная. Яна групіруе людзей. Мы маем шэраг міжнародных шахматных зьездаў, што немагчыма сябе уявіць у адносінах, напрыклад, да карт...

Абмяркоўваючыся з вынікамі абсьледваньняў, а таксама з асабістымі думкамі буйных шахматыстых, былі вызначаны тыя якасьці, якія неабходна мець чалавеку, каб зрабіцца добрым шахматыстым.

Шахматыст павінен уладаць добрым здароўем. Мы ведаем, напрыклад, што шахматыстыя, неўладаючыя гэтай якасьцю, ня вытрымліваюць цяжкасьцяў турнірнай ці матчавай барацьбы. Між тым, найбольш выдатныя сучасныя шахматыстыя, як Капабланка, Алехін і інш. уладаюць вельмі добрым здароўем.

Гэта, бязумоўна, не азначае, што не ўладаючы добрым здароўем, аматар шахматнай гульні не павінен гуляць у шахматы.

Добры шахматысты павінен мець моцныя нэрвы, здольныя вытрымаць шахматнае патрасеньне, самазаўладаньне (бо многія партыі праігрываюцца з-за хваляваньня іграка), павінен умець добра разьмяркоўваць увагу па шахматнай дошцы, мець добрае агульнае разумовае разьвіцьцё, сілу ўяўленьня.

Проф. **Васілейскі** спыніўся яшчэ на пытаньні аб гігіене шахматнай гульні. У шахматах трэба адрозьніваць гульню профэсыйную і гульню аматарскую. Шахматыст-аматар павінен прытрымлівацца некалькіх асноўных правіл. Неабходна захоўваць перапынак у часе гульні, бо доўгае напруджаньне дрэнна адбіваецца на разумовых здольнасьцях.

Нельга гуляць ўначы. Шахматная гульня пасьля працы зьяўляецца непродукцыйнай.

Неабходна некалькі гадзін адпачыць.

Трэба гуляць з прыблізна раўным ворагам.

Твае слова аб тэатру

Вялікі дыспут у БДТ

У аўторак 10-га мая ў Беларускім Дзяржаўным Тэатру адбудзецца вялікі дыспут аб наступных спэктаклях, паказаных менскай моладзі: „Перамога“, „Вір“, „Змрок“, „Стралок Тэль“, „Над Нёмам“ і „Каваль Ваявода“.

Уступнае слова да дыспуту скажа старшыня Інбелкульту тав. У. ІГНАТОЎСКІ. У спрэчках выступяць вядомыя беларускія пісьменьнікі, прадстаўнікі грамадзкіх організацый і ўсе жадаючыя.

Пасьля дыспуту—вялікі концэрт і пастаноўка

Білеты на дыспут распаўсюджаны праўленьнем клюбу імя «КІМ» і рэдакцыяй «Чырвонай Зьмены».

На спатканьне выяжджае судно.

З Ленінграду атрымана паведамленьне, што з Кранштату выяжджае ваеннае судно для спатканьня і перавозкі ў Краншат усебеларускай экскурсыі моладзі.

Дарогу профтэхасьвеце!

Адчыненьне новых школ

Галоўпрафасьветы зараз распрацоўвае 5-гадовы плян разьвіцьця профтэхнічнай адукацыі ў БССР. Плян прадугледжвае пашырэньне профтэхнічнай сеткі, штогодны прыём і выпуск вучняў і г. д.

Па ніжэйшай профтэхасьвеце, згодна пляну, прадугледжана **значнае павялічэньне** профтэхшкол **будаўнікоў і сельска-гаспадарчых школ.** Намечана ў некаторых школах адчыніць аддзяленьні агнятрывалага будаўніцтва.

Пры Менскай аб'яднанай профтэхшколе намечана адчыніць **аўтамабільна-трактарныя курсы.**

У сваёй фінансавай частцы плян зьвяртае галоўную ўвагу на **пашырэньне** выдаткаў па абсталяваньню школ, **павышэньне** заробкаў інструктарскага і педагагічнага **пэрсаналу.**

У бліжэйшыя дні гэты проэкт будзе разглядацца прэзыдыумам Дзяржпляну БССР.

У друкароў

Храмае дысцыплінка

Галоўпрофасьветы правёў абсьледваньне Менскай школы поліграфвытворчасьці. Адзначана слабая пастаноўка вучэбнай справы, недастатковая дысцыплінаванасьць вучняў (па вучэбнай частцы) і дрэннае абсталяваньне ў некаторых аддзяленьнях.

Дасягненьні ў школе наступныя: добры падбор інструктарскага пэрсаналу, павялічэньне зацікаўленасьці вучняў да ўзьняцця сваёй кваліфікацыі і г. д.

Капейкі варушацца

Чарговае зьніжэньне цэн на тавары адбылося у МЦРК перад 1 мая.

Кілё масла замест ранейшых 2 р. 30 к. каштуе ужо 2 р. Кілё падэшвы 1-га сорту замест 3 р. 95 к.—2 р. 80 к., другога сорту замест 2 р. 70 к.—2 р. 60 к. Кілё лімоннай солі замест 4 р. 20 к.—3 р. 10 к.

У зьвязку з летнім сэзонам зьніжаны цэны на галантарэйныя вырабы. Трусы для спорту каштавалі 1 р. 22 к., зараз—1 р. 7 к. Майкі павярховыя каштавалі 2 р. 50 к., зараз—1 р. 72 к. Наскі мужчынскія замест 67 каштуюць 65 к. Панчохі дзіцячыя—44 к., замест 46 к.

Ня так даўно ў нашай газэце быў зьмешчан допіс аб тым, што на хлебным рынку коопэрацыя пачынае здаваць свае пазіцыі крыватніку.

Менцэрабкоп заварушыўся. Сталі падлічваць і падлічылі, што ёсьць магчымасьць зьнізіць цэны на кілё белага хлебу з 28 кап. да 27, кілё калачу таксама з 28 да 27, на францускія і кісла-салодкія булкі з 8 да 7 з пал. к. Гэта новая расцэнка ўжо ўведзена ва ўсіх крамах МЦРК.

Ня гледзячы на гэтыя дасягненьні ёсьць прадмэты, зьніжэньня цэн на якія спажывец наўрад ці адчуе. Гэтак з саламы кілё якога каштавала 1 р. 30 к., зараз каштуе 1 р. 25 кап., а ў прыватніка каштуе 1 р. 15 к. Тое-ж самае атрымліваецца з гарбатай, цану за кілё якой МЦРК зьнізіў на 20 к. Мы ведаем, што населеніцтва купляе гарбату малымі дозамі, прыкладна па 100 і 50 грамаў, з прычыны чаго адчуе зьніжэньне толькі на 1/10 ці 1/20 долю.

З.

Адказы чытачам.

Сонкіну К. (923). Перавод з аднаго факультэту на другі можна зрабіць, трэба толькі ўзгадніць гэта з Праўленьнем Унівэрсытэту (ці інстытуту) і здаць залікі па тым прадмэтам, якія ў вас не праходзіліся.

М. Г. (924). Рэдакцыйная колегія насьценнай газэты, якая зьяўляецца органам вучкому, атрымоўвае паказаньні ад вучкому і аддае яму справаздачу аб сваёй працы.

Гарановічу (925). Рэдакцыя «Чырв. Зьмены» вядзе рэгістрацыю ня толькі комсамольцаў-турыстаў, але ўсёй той моладзі, якая прымала ці будзе прымаць удзел у якой небудзь турысцкай экскурсыі.

Міркіну (926). Для наступленьня ў ВНУ ці тэхнікум не абавязкова прадстаўляць пасьведчаньне аб асьвеце, трэба толькі вытрымаць іспыты.

Бокшч (927) На другі курс рабфаку БДУ будзе ў гэтым годзе прынята 20 чалавек.

Ладуцкаму (928). Калі ўвесь час працуеш па найму на сельскай гаспадарцы, ты лічышся батраком.

У тры радкі.

○ **78 чалавек будуць сёлета прыняты ў Беларускі Комвуз.**

○ Гэтымі днямі адчыняюцца **ўсебеларускія курсы па падрыхтоўцы інструктароў фізкультуры.**

○ Пачаліся **заняткі у Горацкім сялянскім унівэрсытэце.**

○ Выдаткі на сёлетні будаўнічы сэзон у Менску зацьверджаны ў суме **2.375.000** руб.

○ Менская Біржа Працы, разам з юнсэкцыяй, прыступіла да **ўкамплектаваньня курсаў ЦІП на 1927-28 г.**

У зьмены.

Сьвята набліжаецца.

Сьвяткаваньне Міжнароднага Дзіцячага Тыдню і 5-годьдзя існаваньня піонэрскай організацыі ў Менскай організацыі праходзіць пад лёзунгамі падвядзеньня вынікаў гадовай працы і умацненьня інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Менакрбюро ЮП распрацавала падрабязны плян сьвяткаваньня, асноўныя пункты якога зводзяцца да наступнага:

Усе атрады прапрацоўваюць заданьні аб падвядзеньні вынікаў зімняй работы і наладжваюць атрадныя вечары.

Напярэдадні сьвята атрадамі праводзяцца гульні, экскурсіі, маёўкі, з прыцягненьнем школ і неорганізаванай дзетвары.

22-га мая у дзень сьвята наладжваецца дзіцячая дэмонстрацыя-парад і здача на Пляцу Волі ўрачыстага абяцаньня.

Асобныя раёны рыхтуюць карнавалы.

Да дню сьвята прыстасоўваецца пасылка атрадамі лістоў замежным піонэрам.

Акруговая выстаўка.

З 15-га мая па 1-е чэрвеня Акрбюро ЮП організуе ў цэнтральным піонэрскім клюбе акруговую выстаўку піонэрскіх работ, якая будзе адбіваць усе дасягненьні атрадаў.

На кніжнай паліцы.

„Маладняк“, часопісь, № 1—1927 г. Цана 60 кап. стр. 112 Менск.

Ад першага нумару «Маладняка» за 1927 г. чытач мог-ба патрабаваць і большага, чымся ёсьць у часопісу.

Асабліва кульгае тутака літаратурна мастацкі аддзел.

Наперш кідаецца ў вочы надзвычайная колькасьць вершаў, часам ня зусім удалых як «Віратлівы разьбег», «Бліскучы ўсход зары ружовай».

Два апавяданьні—Мурашкі і Галавача на гэты раз таксама не вызначаюцца ні мастацкасьцю, ні зьместам...

Напр., у «Дзьвух сьцежках»—Андрэй як асоба—нежыцьцёвы, ясна-штучны тып, у апавяданьні «Яйцо і сьлівы»—нельга зразумець, хто такі «ён»... Ці гандляр, ці проста «шпана»... Праўда, затрымліваюць увагу сваёй музычнасьцю і прыгожымі вобразамі вершы Маркавай і Дарожнага, як заўсёды мілагучны Чарот у вершы «Заўтра», але гэта ня выкупае якасьці ўсяго часопіса...

У другім разьдзеле—вельмі цікавае пытаньне ўзьнята Астаповічам у артыкуле «Другі бок мэдалі»—аб пісьменьніцкім маладняку. Нам здаецца, што нарэшце апошняга сапраўды варта ўзьняць дыскусію на старонках нашага беларускага друку.

У кнігапісу трэба адзначыць досыць сталую рэцэнзію Янчука аб «Пялёстках» В. Маракова.

Юрка Лявонны.



Падзяка.

Рэдакцыя газэты ЦК ЛКСМБ „Чырвоная Зьмена“ выказвае падзяку студэнтам музтэхнікуму: сьпявачцы тав. Марцьюнка, сьпяваку тав. Марозу і акампаньятару тав. Кляўсу, а таксама удзельнікам духавога оркестру клюбу КІМ за ўдзел у концэрце для нарады бацькоў комсамольцаў.

Рэдакцыя таксама адзначае т. Б. Фрымана, які дапамог організацыі вышэйпаказанага концэрту.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867, Менск, 2 друкарня БДВ. Тыраж ў ліку 4200 экз.